PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 49 (2482) Год XLVIII | Беласток, 7 снежня 2003 г. | Цана 2,00 зл.

Заахвочваем Беларусь

„Ніва" пасля адкрыцця пагранперахода ў Кузніцы-Беластоцкай пыталася ў прэм'ера Лешка МІЛЕРА:

— Вы ўспаміналі аб тым, што мяжа Еўрасаюза не можа замыкацца на Бугу. Якую тады ролю павінна ў далейшым пашыранні ЕС адыгрываць Польшча ў адносінах да ўсходніх суседзяў?

— Нельга нам будаваць на нашай усходняй мяжы ніякую заслону, ні жалезную, ні аксамітную, ані новы мур. Мяжа павінна быць шчыльная для паталогій, злачыннасці, але мусіць быць адкрытая для пасажырскага руху, тавараага абмену, пераплыву капіталу. Нашым прыкладам павінны мы заахвочваць усходніх суседзяў, пераконваць, што цяжкая трансфармацыя, якая гадамі здзяйсняецца ў Польшчы, і што курс на еўрапейскую арыентацыю — крыніца поспехаў і варта ісці гэтай дарогай, бо і нашы ўсходнія суседзі могуць такім чынам дасягнуць поспеху.

— Але ці, на Вашу думку, з беларускага боку ёсць такое зацікаўленне? Як вядома, Беларусь хіліцца да Расіі.

— Я мяркую, што зацікаўленне ёсць. Нашы ўсходнія суседзі, таксама і Беларусь, глядзяць на Польшчу з вялікай увагай і зацікаўленнем. Польшча можа быць заахвочваючым прыкладам для адпаведнай палітыкі для Беларусі.

— Чаго канкрэтна датычылі Вашы размовы з прэм'ерам Беларусі ў Варшаве?

— Перш за ўсё мы ацанілі гаспадарчыя адносіны, прызнаючы, што ёсць у нас яшчэ агромныя рэзервы. Прэм'ер Беларусі ўспомніў аб некалькіх цікавых інвестыцыях, у якіх могуць удзельнічаць польскія капітал і прадпрымальнікі. Я інфармаваў аб нашай дарозе ў ЕС, заахвочваючы свайго суразмоўцу, каб Беларусь брала з нас прыклад.

— Ці новы візавы рэжым меў, на Вашу думку, уплыў на польска-беларускае супрацоўніцтва?

— Варта заўважыць, што ўвядзенне віз не паўплывала на нейкае абмежаванне ані ў пасажырскім руху, ані ў гандлі. Выглядае на тое, што сёлетні гандлёвы абарот з Беларуссю будзе большы, чым леташні і трансгранічны гандаль не паменшыцца. Можна сказаць, што апаскі, якія спадарожнічалі ўвядзенню візавай сістэмы, на шчасце, не апраўдаліся.

Владзімеж Цімашэвіч дадаў:

— Да ўчора (22 лістапада) выдалі мы 225 тысяч віз для грамадзян усходніх суседзяў Польшчы. Гэта амаль 50 прац. колькасці віз выдадзеных за ўвесь мінулы год ва ўсіх краінах свету польскімі консульствамі. Выканалі мы ўсё гэта на працягу паўтара месяца.

Пытаўся Мацей Халадоўскі

Рэпартаж з адкрыцця пагранперахода — на стар. 3

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Вымушаны гаспадарыць

Аляксей Мароз

У Махнатым каля 15 малодшых гаспадароў. Сярод іх толькі некалькі асоб мадэрнізавалі свае гаспадаркі і прыстасавалі да еўрапейскіх патрабаванняў.

Калі ў пахмурнае надвор'е еду праз Старое Беразова і Махнатае, на вуліцы пуста. Сумнымі паказваюцца мне вялікія мураваныя і драўляныя дамы, якія будаваліся дваццаць-трыццаць гадоў таму.

У Махнатым пытаюся мужчын пра пілатажныя спатканні на тэму даплат да сельскагаспадарчай вытворчасці. Мае суразмоўцы крытычна ацэньваюць сённяшнюю палітыку ўлад у адносінах да сельскай гаспадаркі, надалей адмоўна ўспрымаюць намаганні Польшчы ўступіць у Еўрасаюз і з настальгіяй успамінаюць мінулае. Раней у Старое Беразова і Махнатае прывозілі экскурсіі, каб паказаць узорныя вёскі з прыгожымі дамамі і гаспадаркамі. Многія гаспадары працавалі ў Гайнаўцы або Бельску-Падляшскім. Пасля працы на прадпрыемствах рускімі трактарамі маркі „Уладзімірац" і польскімі „Ц-330" абраблялі добрую, як на ўмовы Гайнаўшчыны, зямлю. Іх жонкі і дзеці даглядалі жывёлу. Калі былі грошы, вяскоўцы будавалі прыгожыя дамы. Куплялі „фіаты", „паланезы" і патрэбную сельгастэхніку. Некаторыя за выручаныя грошы будавалі дзецям дамы ў гарадах. Дзесяцігектарных гаспадарак хапала для дастатковага жыцця. Складанасці паявіліся, калі ў краіне пачаліся перамены. Тады страцілі працу „хлопа-работнікі" і панізіўся даход з гаспадарак. Закрылі чыгуначную лінію з Бельска ў Гайнаўку, якой карысталіся жыхары абедзвюх вёсак. Гэта пазбавіла старэйшых людзей зручнага даезду да лекараў і абмежавала выезды за пакупкамі. Малодшыя сяляне паспрабавалі дастасавацца да новых умоў гаспадарання. Пачалі купляць і браць у арэнду зямлю, дакупілі кароў і пачалі інвеставаць у сельскагаспадарчую тэхніку. Аднак вялікія працэнты пад крэдыты прытармазілі іх энтузіязм. Зараз людзі наракаюць на ўмовы гаспадарання і з вялікай асцярожнасцю глядзяць на перспектывы даплат да сельскагаспадарчай вытворчасці.

— Калі нехта зробіць сур'ёзныя памылкі ў дакументах, то могуць забраць нават каля 50% даплат на тры гады, — заўважае Аляксей Лаеўскі з Махнатага, які запомніў перасцярогі працаўніку Гайнаўскага аддзялення Агенцтва рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі. Арганізавалі яны летам адукацыйную сустрэчу ў Махнатым, у час якой вучылі як мерыць поле і пісаць заявы наконт даплат да сельскагаспадарчай прадукцыі. Пасля трэба было запаўняць шматлікія фармуляры і падаваць іх у Гайнаўскае аддзяленне агенцтва. Кантраляваць прыязджалі працаўнікі ваяводскіх структур агенцтва, але вынікаў кантролю гаспадары з Махнатага яшчэ не ведаюць. Пілатажная работа з гаспадарамі Махнатага праводзілася дзеля праверкі вынікаў адукацыйнай працы.

— Найгорш было падлічыць плошчы для даплат, калі нейкі раўчак праходзіць цераз поле, а вакол яго кусты растуць. Складана было абмерыць

[працяг ☞ 3]

Прэм'ер Беларусі ў Польшчы

☞ 2

У рамках сустрэчы прэзідэнта Польшчы з кіраўнікамі ўрадаў краін-удзельніц Цэнтральна-Еўрапейскай Ініцыятывы адбыліся размовы прэм'ера С. Сідорскага з прэзідэнтам А. Кваснеўскім і міністрам замежных спраў Владзімежам Цімашэвічам па пытаннях беларуска-польскіх адносін.

Перасоўванне мяжы

☞ 3

У час кароткай прэс-канферэнцыі Лешак Мілер паінфармаваў аб сваёй сустрэчы з прэм'ерам Беларусі, якая адбылася дзень раней. „Я заахвочваў пана прэм'ера, каб Беларусь арыентавалася на кантакты з ЕС, вядома, выпаўняючы ўсе неабходныя крытэрыі. Стараемся ўтрымліваць з Беларуссю кантакты, якія заахвоцілі б яе ўладу да дэмакратычнага курсу і дэмакратычных перамен".

Вяртанне прывіду „Бурага"

☞ 4

Высновы з вяртання прывіду „Бурага" вельмі сумныя. Установы правасуддзя дэмакратычнай краіны далі надта выразны сігнал, што можна апраўдаць кожнае злачынства, калі яно ўчыненае ў інтарэсе дзяржавы ці нацыі. Невядома аднак якую сувязь з інтарэсамі краіны мела знішчэнне яе мірных грамадзян.

Юбілейны канцэрт „Перапёлкі"

☞ 8

У гэты святочны вечар ансамблю было прысвоена імя „Перапёлка". Хроснымі бацькамі былі Ірэна Сегень і Міраслаў Мордань, а патранат над ансамблем узяў Гайнаўскі малочны кааператыў. Ганаровае месца ў праграме юбілейнага мерапрыемства выпала ансамблю „Спадчына" з Пружан.

Як трэба жыць?

☞ 9

Пасля даклада сабраныя пыталі архіепіскапа Ірэмію пра патрэбу прыкрывання галавы жанчыне, якая ўваходзіць у царкву. Уладыка прачытаў фрагмент з Паслання апостала Паўла, дзе сказана, што прыкрыванне галавы з'яўляецца праявам пакорлівасці жанчыны ў адносінах да мужа. Таксама і старая традыцыя наказвае накрываць галаву ў час малітваў.

Беларускі каляндар „Нівы" на 2004 год...

... з'явіцца ў 51 нумары нашай газеты — каля 21 снежня г.г.

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Прэм'ер Беларусі ў Польшчы

20 лістапада г.г. у Варшаву для ўдзелу ў сустрэчы кіраўнікоў дзяржаўудзельніц Цэнтральна-Еўрапейскай Ініцыятывы прыбыў выконваючы абавязкі прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Сяргей Сідорскі.

У ходзе візіту адбыліся перагаворы кіраўніка беларускага ўрада з кіраўніцтвам Польскай нафтагазавай кампаніі. Бакі абмеркавалі пытанні супрацоўніцтва Беларусі і Польшчы ў нафтагазавай галіне. Была адзначана агульная зацікаўленасць расшырэння ўзаемавыгадных кантактаў па пытаннях транзіту газу цераз тэрыторыю Беларусі і Польшчы, абмеркавана магчымасць захоўвання запасаў газу для патрэб Польшчы і Беларусі, а таксама польскіх інвестыцый у развіцці газавай галіны ў Беларусі.

У ходзе сустрэчы беларускага прэм'ера з кансорцыумам польскіх фірм, якія плануюць прыняць удзел у тэндэры на будову ТЭЦ у Брэсце, з удзелам прадстаўнікоў урада Польшчы была адзначана агульная зацікаўленасць бакоў у рэалізацыі праекта. Выконваючы абавязкі прэм'ер-міністра выступіў на адкрыцці прэзентацыі „Рэспубліка Беларусь: магчымасці для дзелавога супрацоўніцтва".

У другой палове дня 20 лістапада г.г. адбыліся перагаворы Сяргея Сідорскага з Ежы Гаўзнерам — віцэ-прэм'ерам польскага ўрада, міністрам гаспадаркі, працы і сацыяльнай палітыкі. У той жа дзень, у рамках сустрэчы прэзідэнта Польшчы з кіраўнікамі ўрадаў краін-удзельніц ЦЕІ, адбыліся размовы прэм'ера С. Сідорскага з прэзідэнтам А. Кваснеўскім і міністрам замежных спраў Владзімежам Цімашэвічам па пытаннях беларуска-польскіх адносін.

21 лістапада С. Сідорскі выступіў на пленарнай сесіі саміта ЦЕІ на ўзроўні кіраўнікоў урадаў. Кіраўнік беларускай дэлегацыі агучыў пазіцыю Беларусі ў адносінах да перспектыў і прыярытэтаў дзейнасці ЦЕІ ва ўмовах будовы новай Еўропы. Заклікаў ён да замацавання клімату добрасуседства і супрацоўніцтва, пераходу да фармавання асноў агульнай эканамічнай прасторы.

21 лістапада адбылася двухбаковая сустрэча з прэм'эрам Польшчы Лешкам Мілерам. У ходзе спаткання бакі дамовіліся, што прымуць актыўныя дзеянні па мінімізацыі магчымых адмоўных паслядоўнасцей пашырэння ЕС для беларуска-польскіх гандлёва-гаспадарчых адносін.

Завяршаючы пабыўку на саміце ЦЕІ ў Варшаве в.а. прэм'ер-міністра Беларусі С. Сідорскі правёў сустрэчу з членамі „Усходняга клуба" Польшчы (таварыства па падтрымцы гаспадарчага супрацоўніцтва з Усходам). У спатканні прынялі ўдзел член клуба, памочнік прэзідэнта Польшчы Станіслаў Цёсак, прадстаўнікі буйнейшых польскіх прадпрыемстваў і бізнесмены.

Кіраўнік урада Беларусі сустрэўся з мітрапалітам Варшаўскім і ўсяе Польшчы Савам. Прэм'ер заслухаў інфармацыю аб сітуацыі ў рэгіёне дзейнасці Польскай аўтакефальнай праваслаўнай царквы, аб яе ролі ў развіцці праваслаўя ў краіне, а таксама захаванні культуры і свядомасці нацыянальных меншасцей, у тым ліку і беларускай меншасці. С. Сідорскі выказаў мітрапаліту прызнанне за дзейнасць Царквы, накіраваную на падтрымку этнічных беларусаў Польшчы.

21 лістапада г.г. адбылася прэс-канферэнцыя в.а. прэм'ер-міністра Беларусі С. Сідорскага для прадстаўнікоў беларускіх і польскіх СМІ. Кіраўнік беларускага ўрада даў эксклюзіўнае інтэрв'ю газеце „Жэчпосполіта".

Паводле Інфармацыйнага бюлетэня Пасольства РБ у Польшчы

Сустрэча парламенцкіх груп Беларусі і Польшчы

17-19 лістапада ў Брэсцкай вобласці адбылася другая рабочая сустрэча прадстаўнікоў дэпутацкіх груп па супрацоўніцтве паміж парламентамі Беларусі і Польшчы.

Парламенцкую групу Беларусі ўзначаліў старшыня Камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Савета Рэспублікі Нацыянальнага Сходу Мікалай Чаргінец, а парламенцкую групу Польшчы — дэпутат Сейма Яўген Чыквін.

17 лістапада беларускія і польскія парламентарыі сустрэліся са старшынёю Брэсцкага выканаўчага камітэта У. Даўгалёвым і старшынёю абласнога Савета дэпутатаў Л. Лемяшэўскім. Адбыўся цікавы абмен меркаваннямі адносна перспектыў беларуска-польскага супрацоўніцтва на рэгіянальным узроўні, дасканалення прыгранічнай інфраструктуры, паглыблення ўзаемадзеяння ў гандлёва-эканамічнай сферы. У той жа дзень польскія госці наведалі калектыўнае прадпрыемства „Астрамечава", дзе пазнаёміліся з вопытам буйнатаварнай сельскагаспадарчай вытворчасці.

18 лістапада на сумесным пасяджэнні прадстаўнікоў дэпутацкіх груп былі разгледжаны шырокія колы пытанняў, звязаных з далейшым паглыбленнем беларуска-польскага міжпарламенцкага супрацоўніцтва, павышэннем яго ролі і значэння ў развіцці двухбаковага ўзаемадзеяння.

У цэнтры ўвагі дэпутатаў былі праблемы мінімізацыі паслядоўнасцей увядзення між Беларуссю і Польшчай візавага рэжыму, дасканалення пагранічнай інфраструктуры, а таксама гарманізацыі нарматыўна-прававой базы ў сферы забеспячэння прыродаахоўнай дзейнасці.

Дэпутатамі Нацыянальнага Сходу і Сейма былі абмеркаваны перспектывы ўзаемадзеяння бакоў ва універсальных міжнародных арганізацыях, сумесныя крокі па ўмацаванні клімату даверу і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва ў рэгіёне. Па выніках другой рабочай сустрэчы прынята сумесная дэкларацыя, а таксама падрыхтаваны план сумесных мерапрыемстваў парламенцкіх груп на 2004 год.

Інфармацыйны бюлетэнь Пасольства РБ у Польшчы

Знікаючыя перспектывы

Беларуска-расійская інтэграцыя за апошні час паказала істотную тэндэнцыю да змянення. Адным з найцікавейшых момантаў гэтага працэсу становяцца стасункі з Крамлём беларускай апазіцыі. Канешне, казаць аб нейкім наўпроставым уплыве на кіраўніцтва Расіі з боку беларускіх антылукашыстаў яшчэ заўчасна, але сёлетнія іх сустрэчы ў Маскве з палітолагамі, палітэкспертамі і аналітыкамі наводзяць на думку, што палітычныя апаненты Аляксандру Лукашэнку становяцца цікавымі ў „трэцім Рыме".

Спатканні беларускіх апазіцыянераў з расійскім палітычным бамондам, звычайна правага кірунку, насілі з мінулага года даволі сталы характар. Аналізуючы паведамленні прэсы прыходзіш да высновы, што найбольш вызначылася тут кіраўніцтва Аб'яднанай грамадзянскай партыі, якая мела калісьці моцную фракцыю ў парламенце — Вярхоўным Савеце. Але нават частыя вандроўкі ў Маскву надавалі большае значэнне гэтай партыі хіба толькі ў сваіх уласных вачах. Прэзідэнцкая ўлада выкарыстоўвала такія кантакты з выгадай для сябе, багата паліваючы інфармацыйным „брудам" не маючых выйсця да дзяржаўных СМІ палітычных апанентаў. Тут дастаткова ўзгадаць выпадак у мінскім аэрапорце, калі спроба ўдзелу ў канферэнцыі па пытаннях беларуска-расійскіх стасункаў скончылася для Барыса Нямцова, кіраўніка адной з расійскіх правых партый дэпартацыяй, забаронай на ўезд у Беларусь і абвінавачаннямі ў фінансаванні беларускай апазіцыі.

Але такое становішча, калі ваяжы ў расійскую сталіцу больш былі патрэбныя беларускім апазіцыянерам, па ўсяму відаць, праходзяць. Афіцыйная палітыка Беларусі гэтага года заўважна адрозніваецца ад леташняй. На пярэдні план для А. Лукашэнкі выйшаў прынцып „Не до жиру — быть бы живу". Паварот ад інтэграцыйных лозунгаў да ідэалогіі беларускай дзяржавы, хай блытанай, мала для каго зразумелай і, верагодна, часовай з'явы, засведчыў імкненне цяперашняга беларускага прэзідэнта да захавання ўсіх эканамічных рычагоў свайго панавання перад рэальна ўзнікшай небяспекай пранікнення буйнога расійскага капіталу ў Беларусь, калі, вобразна кажучы, беларускую палітычную музыку будзе заказваць расійскі капіталіст.

Разам з тым нецалкавітая адпаведнасць дзеянняў А .Лукашэнкі патрабаванням расійскіх палітычных і эканамічных вярхоў прывяла да таго, што цяпер расіяне пачалі „зандзіраваць глебу" на прадмет альтэрнатывы беларускаму „бацьку". Так, напрыканцы лета ў сталіцу Расіі былі запрошаны прадстаўнікі беларускіх апазіцыйных партый правага кірунку. Сустрэчу з імі ладзіў так званы „Савет па знешняй і абароннай палітыцы Расіі". Нягледзячы на гучную назву, гэта ўсяго толькі грамадскае аб'яднанне, якое, тым не менш, мае адпаведны ўплыў на фармаванне палітычных поглядаў крамлёўскага кіраўніцтва. Абмен думкамі на прадмет развіцця расійска-беларускіх дачыненняў і апазіцыйных поглядаў на іх абодва бакі прызналі карысным. Сцвярджаючы непахіснасць прынцыпу незалежнасці і суверэнітэту Беларусі, апазіцыя, больш таго апазіцыя правая, нацыянальная, прызнае вялікае значэнне ў беларускіх справах расійскага стаўлення.

Наступным крокам азнаямлення з беларускім апазіцыйным бамондам вышэйзгаданага Савета стала лістападаўская сустрэча з кіраўніцтвам партый левага накірунку і некаторымі дэпутатамі цяперашняга беларускага парламента. Цікава, што ўдзел у гэтым спатканні прыняла дэпутат Наталля Машэрава, дачка Пятра Машэрава, трагічна загінуўшага колішняга камуністычнага кіраўніка Беларусі, які і дагэтуль карыстаецца пашанай у народзе. Па выніках сустрэчы, выявілася, мабыць, самае галоўнае, што не даспадобы расіянам — меркаванне аб павелічэнні ў беларускім кіраўніцтве колькасці людзей з антырасійскімі поглядамі. А гэта ў сваю чаргу перашкаджае станаўленню т.зв. Саюзнай дзяржавы, а кажучы проста — уплыву Расіі на сітуацыю ў Беларусі. Больш таго, аб перашкодзе аб'яднання ў адну дзяржаву з боку А. Лукашэнкі ўжо заяўляюць некаторыя расійскія палітыкі яскравай нацыяналістычнай афарбоўкі, кшталту Дзмітрыя Рагозіна, які заўсёды вызначаўся непрыманнем дзяржаўнасці Беларусі.

Цяжка сказаць куды завядзе цяперашняе беларускае кіраўніцтва неакрэсленая пазіцыя ў вызначэнні свайго месца і месца Беларусі ў палітычнай прасторы сучаснай Еўропы. Але відавочна, што ні лаўры аб'яднальніка, ані беларускага незалежніка Аляксандру Лукашэнку ўжо не „свецяць".

Уладзімір Лапцэвіч

Сустрэча кіраўнікоў мытных служб Польшчы і Беларусі

22 лістапада 2003 года ў Кузніцы-Беластоцкай адбылася сустрэча старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Шпілеўскага з намеснікам міністра фінансаў, кіраўніком мытнай службы Польшчы Робертам Кваснякам. У сустрэчы прымаў удзел пасол Беларусі ў Польшчы Павел Латушка.

У ходзе сустрэчы адбыўся абмен думкамі па пытаннях узаемадзеяння мытных служб Беларусі і Польшчы. Па выніках перамоў дасягнута дамоўленасць аб падтрымцы польскім бокам падыходаў Беларусі па выдаткаванню з боку Еўракамісіі сродкаў на развіццё інфраструктуры на беларускім баку дзяржаўнай мяжы. У тым ліку былі ўзгоднены падыходы па ўзаемадзеянні ў рамках рабочай сустрэчы кіраўнікоў мытных службаў краін-членаў і кандыдатаў у члены ЕС, запланаванай на 28 лістапада 2003 года ў Рыме, у якой чакаецца ўдзел старшыні Дзяржмытні Беларусі А. Шпілеўскага.

Бакі прыйшлі да разумення неабходнасці выраўноўвання колькасці супрацоўнікаў мытных служб Беларусі і Польшчы на сумеснай мяжы ўжо ў першай палове 2004 года. Адбыўся абмен думкамі адносна падыходаў да магчымасці арганізацыі сумеснага мытнага кантролю транспартных сродкаў і асоб на пунктах пропуску беларуска-польскай мяжы.

Дасягнута дамоўленасць аб працягванні рэгулярных кантактаў кіраўнікоў мытных ведамстваў Беларусі і Польшчы.

Інфармацыйны бюлетэнь Пасольства РБ у Польшчы

Перасоўванне мяжы

— Не можа тут быць мяжа, якая будзе аддзяляць Еўрасаюз і Польшчу ад нашых усходніх суседзяў. Мусіць гэта быць мяжа, якая яднае, але будзе бар'ерам для розных паталогій. Мусіць быць, аднак, месцам прыязным для пераплыву тавараў, капіталу і людзей. Выказваю перакананне, што ўсходняя мяжа ЕС праз нейкі час будзе далей перасунута на Усход, бо ж Еўропа не канчаецца на Бугу, — сказаў Лешак Мілер у час адкрыцця пагранперахода ў Кузніцы-Беластоцкай.

Пераход у Кузніцы пусцілі ў рух 22 лістапада, пасля трох гадоў мадэрнізацыі і ледзь не ў тыдзень пасля завяршэння рамонту шасці адрэзкаў шляху Беласток — пагранпераход у Баброўніках (разам 20 кіламетраў).

Усюды сучаснасць

З 2 гектараў плошчы пагранпераход у Кузніцы пашырыўся да 18 га. Можна тут афармляць у суткі 8 тысяч легкавых аўтамашын, 1,5 тыс. грузавых і 25 тысяч асоб. У першыя 6 гадзін выехала адсюль 13 грузавікоў, уехала — 10. Да распараджэння вадзіцелі маюць тут 230 месцаў на стаянках і 8 палос для аўтамашын і аўтобусаў у абодвух напрамках. На тэрыторыі польскай часткі пагранпераходa стаяць 40 будынкаў. Пераход сучасна абсталяваны і поўнасцю камп'ютэрызаваны. Ёсць тут м.інш. 129 камер і электронныя датчыкі, пункты комплекснага кантролю фітасанітарных і ветэрынарных службаў, электронныя шалі і рэзервуары на сцёкавыя воды. Кошт інвестыцый — больш за 220 мільёнаў зл., з чаго адна чвэрць паходзіла з еўрасаюзных сродкаў. 600 тыс. зл. з польскага бюджэту пайшло на пабудову дарогі на беларускім баку. Мадэрнізаваны беларускі адрэзак перахода мае быць здадзены ў карыстанне, магчыма, што ў будучым годзе. Мабыць, можа тады дойдзе да супольных польска-беларускіх мытных кантроляў; пакуль працягваюцца перамовы наконт гэтай справы.

Пакуль што, на польскім баку працуюць 104 мытнікі (мае тут быць іх 150) і 160 функцыянераў Памежнай стражы (будзе іх на 40 больш; падтрымліваюць іх 33 пагранічнікі кандыдацкай службы).

ЕС: палітыка добрага суседства

Ва ўрачыстым адкрыцці пагранперахода прыняла ўдзел немалая колькасць афіцыйных гасцей, сярод іх — прэм'ер Лешак Мілер, міністр замежных спраў Владзімеж Цімашэвіч, пасол прадстаўніцтва Еўрапейскай камісіі ў Польшчы Бруна Дэтомас, паслы і консулы абедзвюх дзяржаў і ваяводы — гродзенскі і беластоцкі.

— Гэты пагранпераход — рэалізацыя польскай стратэгіі ў галіне дастасоўвання краіны да патрабаванняў Еўрасаюза, — прыпамінаў падляшскі ваявода Марэк Стшалінскі. — Некалькі тыдняў таму быў здадзены ў карыстанне апошні будынак Памежнай стражы. Цяпер, адкрываючы гэты пагранпераход, можам сказаць, што канчаем стварэнне асноўнай інфраструктуры на польска-беларускай мяжы.

На думку прэм'ера Л. Мілера, каб еўрасаюзная мяжа не канчалася на Бугу, „нашы ўсходнія суседзі, сярод іх Беларусь, мусяць прайсці яшчэ далёкую дарогу".

— Сёння жадаю ім таго, каб Еўропа была больш бяспечная, больш канкурэнтная, каб давала сваім грамадзянам вышэйшы ўзровень жыцця. Мы ў Польшчы шмат ужо зрабілі ў гэтым напрамку.

Пасол прадстаўніцтва ЕС у Польшчы падкрэсліў:

— Польшча атрымае разам на праекты звязаныя з мяжой 500 млн. еўра (прыстасаванне да фітасанітарных, ветэрынарных стандартаў і г.п.). Польшча ў гэтай сферы будзе мець найлепшае і найбольш сучаснае абсталяванне. Кузніца ў гэтым мерапрыемстве — найважнейшы элемент.

І дадаў:

— Добра ахоўваная мяжа не азначае мяжы замкнутай. Дзякуючы мадэрнаму абсталяванню перасяканне гэтай мяжы павінна быць лягчэйшае, чым раней. Бяспека не азначае толькі кантролю, але і лепшае супрацоўніцтва мундзірных службаў па абодвух баках мяжы. Еўрасаюз вялікае значэнне дае пашырэнню і экспарту каштоўнасцей, якія ЕС прадстаўляе таксама звонку. Гэта тэма яго палітыкі і добрага суседства. Няма сумненняў, што дзякуючы гэтай палітыцы трансгранічнае і прыгранічнае супрацоўніцтва яшчэ паправіцца.

Фота МАЦЕЯ ХАЛАДОЎСКАГА

Пасол ад ЕС у Польшчы Бруна Дэтомас і прэм'ер Лешак Мілер адкрываюць мяжу. За прэм'ерам — камендант ПС ген. Юзаф Клімовіч

Ёсць патрэба ў новых пагранпераходах

У час кароткай прэс-канферэнцыі Лешак Мілер паінфармаваў аб сваёй сустрэчы з прэм'ерам Беларусі, якая адбылася дзень раней.

— Я заахвочваў пана прэм'ера, каб Беларусь арыентавалася на кантакты з ЕС, вядома, выпаўняючы ўсе неабходныя крытэрыі. Стараемся ўтрымліваць з Беларуссю кантакты, якія захоцілі б яе ўладу да дэмакратычнага курсу і дэмакратычных перамен.

У сваю чаргу міністр Владзімеж Цімашэвіч заявіў:

— 12 снежня дойдзе да даўно планаваных польска-беларускіх перамоў наконт іншых пагранпераходаў на нашай мяжы. Маю надзею, што на ўзроўні віцэ-міністраў і шэфаў розных службаў паразуменне будзе дасягнута. Пасля пацвердзім яго на палітычным узроўні. І гэта павінна стварыць ясную і празрыстую перспектыву. Ёсць патрэба адкрыцця новых пераходаў. Хопіць паглядзець на тое, чаго чакаюць людзі перасякаючыя мяжу.

Неўзабаве ў размове з журналістамі пасол РБ у Польшчы Павел Латушка, у якога пыталіся аб магчымасці адкрыцця новых пераходаў, сказаў:

— Гэтыя пераходы будуць служыць не толькі Беларусі і Польшчы, але і заходняй і ўсходняй Еўропе. Дафінансаванне тады аднаго і другога боку павінна быць роўнае. Інакш узнікне „бутэлька", з аднаго боку шырэйшая, з другога — вузкая. А пяройдзе столькі грамядзян, колькім удасца праціснуцца праз тое горла. Так кажам і ў Бруселі, так размаўляем і з нашым польскім партнёрам.

— Ці Беларусь выказвае гатоўнасць набліжэння да Еўрасаюза? — пыталі мы спадара пасла.

— Беларусь гістарычна і тэрытарыяльна — у Еўропе. Будучыня Беларусі — дэмакратычная еўрапейская дзяржава. Я ў гэтым упэўнены. Беларусь адкрытая на супрацоўніцтва з ЕС. Сёння ставіцца пытанне, ці ЕС адкрыты на Беларусь. Пачынае адкрывацца, але не ў ста працэнтах. Прэм'еры Польшчы і Беларусі размаўлялі аб гэтым у Варшаве; мы прысуджаны на супрацоўніцтва.

— А ці Беларусь гатова была б фармальна прыступіць да еўрасаюзных структур?

— Палітычна такой заявы не даем. Але ў будучыні, хто ведае... Пабачым, як нашы заходнія суседзі будуць функцыянаваць у ЕС і тады вернемся да гэтага пытання.

Мацей Халадоўскі

Вымушаны гаспадарыць

[1 ☞ працяг]

плошчы пасеваў, калі яны знаходзіліся на адным вялікім участку зямлі. Пра плошчу сельскагаспадарчых участкаў, зарэгістраваных у геадэзічным аддзяленні можна было даведацца ў гмінных работнікаў, — кажа Аляксей Лаеўскі. — Я лічу, што ў наступным годзе яшчэ не будзе даплат, бо адпаведную камп'ютэрную сістэму не паспеюць падрыхтаваць. Цяжка сказаць, што будзе і ў 2005 годзе, бо міністры ўвесь час мяняюцца.

Разбудавалі гаспадаркі ў Махнатым толькі некалькі асоб. Дакупілі яны зямлю і гадуюць кароў. Новыя аборы сведчаць, што гаспадары інвестуюць надалей.

— Горш будзе ў Еўрасаюзе, бо будуць большыя патрабаванні ў адносінах да жывёлаводаў. Увядуць 22% падатак ПДВ і перастануць даваць даплаты да паліва, а таннае збожжа з захаду і Венгрыі панізіць цэны на нашу раслінную прадукцыю, — кажа Міраслаў Карпюк з Махнатага.

Мае суразмоўцы станоўча ацэньваюць адукацыйнае спатканне наконт даплат.

— Каб не адукацыя працаўнікоў агенцтва, хто там патрапіў бы запоўніць правільна ўсе дакументы. У адукацыйнай літаратуры ўсяго не прачытаеш, — гаворыць Аляксей Лаеўскі.

На панадворку Міхала Германовіча сустракаю гаспадыню.

— Зараз цяжка гаспадарыць. Цэны на мінеральныя ўгнаенні і іншыя сродкі прадукцыі ідуць угору, як агонь, а цэны на нашыя прадукты застаюцца на месцы, а нават на некаторыя паніжаюцца. Раней за малако плацілі больш чым па 1 злот за літр, а зараз за якаснае малако атрымліваем па 80 грошаў за літр. Калі рашыцца пакінуць гаспадарку, то хто прыме нас на працу? Мы вымушаны гаспадарыць. Нядаўна мадэрнізавалі абору, прыстасоўваючы яе да еўрапейскіх патрабаванняў. Дакупілі крыху зямлі і гадуем 17 кароў. Аднак не рашыліся выступіць да фонду САПАРД за фінансавай дапамогай на куплю трактара, бо трэба спачатку вылажыць свае сродкі. Пасля здаралася, што гаспадары не атрымлівалі абяцаных грошай, бо кантралёры знаходзілі недахопы ў аборах або гаспадарках, — кажа спадарыня Германовіч.

Яна таксама адмоўна ацэньвае бюракратыю, якая спадарожнічае атрыманню даплат.

— Адзін старэйшы гаспадар нервавуся ў час адукацыйнага спаткання. Казаў, што не хоча вучыцца запаўняць дакументы і адракаецца даплатаў. З дакладнасцю да адной сотай гектара трэба будзе памерыць усе ўчасткі поля. Добра, што работнікі агенцтва, якія раней нас вучылі, дапамагалі. Малайцы, бо без іх самі мы не справіліся б, — гаворыць спадарыня Германовіч.

Аляксей Мароз

Весткі з Арлянскай гміны

Патрэбны транспарт

Войт Міхал Іванчук 24 верасня г.г. звярнуўся ў бельскую транспартную фірму „Pogoda-Express", каб адкрыць дзве транспартныя лініі на абшары Арлянскай гміны. Адзін маршрут (пачаткова адзін раз у тыдзень — у чацвер) выходзіў бы з Бельска (ад'езд 6^{30}-7^{30}) праз Градалі, Дыдулі, Круглае, Чахі-Забалотныя, Паўлінова, Вульку-Выганоўскую, Рыгораўцы, Маліннікі, Шарні і праз Орлю вяртаўся б у Бельск. Другі, у той самы час, з Бельска праз Градалі, Дыдулі, Чахі-Забалотныя, Вульку-Выганоўскую ў Кляшчэлі з магчымасцю прадаўжэння ў Рудуты, Тапаркі, Сакі і Сухавольцы. Пасля паўтарагадзіннага перапынку ў Кляшчэлях машына вярталася б тым жа маршрутам назад.

Міхал Мінцэвіч

У сябе — не на сваім

Беларускую вёску Беласточчыны беспрэцэдэнтна выкупоўвае варшаўска-беластоцкае чынавенства, а нам — на нашай Бацькаўшчыне — прапануюцца дамы спакойнай старасці. Чытачы звярнулі ўвагу на яшчэ адзін аспект справы — мы, мясцовае беларускае насельніцтва, абсалютна прайгрываем у гмінных і павятовых аўкцыёнах на зямлю з польскімі пакупнікамі. У нас не хапае грошай скласці ім канкурэнцыю. Мяняецца прапорцыя ўласнасці ў нашых вёсках, калі зямлю прадае дзяржаўнае агенцтва. Сотні яе гектараў апынаюцца ў руках аднаго чалавека звонку, а мы ўсяго можам уяўляць як адчувалі сябе амерыканскія індзейцы, калі пазбаўлялі іх маёмасці ды права на ўласную зямлю. Застаецца п'янства, дэгенерацыя і наёмніцтва. Вось і пра такую зямельную сітуацыю, якая склалася ў вёсцы Гацькі Бельскай гміны, пісаў нядаўна ў „Ніве" Мікола Ваўранюк. Ці ўдасца выйграць людзям з Гацькоў — спадзяюся, што так. У гэтым жа становішчы, якое зараз склалася, узгадваюцца несмяротныя радкі паэмы Якуба Коласа „Новая Зямля". Прачытайма іх яшчэ раз: бацькі — дзецям, дзеці — бацькам. Няхай прачнецца наш сялянскі радавод, бо ад свайго не ўцячэш.

... А дзе ж той выхад? дзе збавенне
З няволі цяжкай, з паланення?
Адзін ён ёсць: зямля, зямля,
Свой пэўны кут, свая ралля:
То — наймацнейшая аснова
І жыцця першая умова.
Зямля не зменіць і не здрадзіць,
Зямля паможа і дарадзіць,
Зямля дасць волі, дасць і сілы,
Зямля паслужыць да магілы,
Зямля дзяцей тваіх не кіне,
Зямля — аснова ўсёй айчыне.

Не ідзе тут пра тое, каб мы ўсе вярнуліся ў свае вёскі і з канём, ці нават і без яго, аралі нашы малазямельныя ўчасткі. Гэта смешна і абсурдна. Справа ў тым, каб прадзедавай зямлі не аддаць з-за сваёй беднасці — таму што раптам апынемся ў сітуацыі, калі будзем надалей у сябе, але не на сваім.

Што на гэта законы?

Апісаная сітуацыя — на жаль, ужо рэальнасць паўднёва-ўсходняй Беласточчыны. Пры такім тэмпе выкупу зямлі ды новай хвалі асадніцтва могуць быць адменены нацыянальныя прапорцыі. А на гэта не дазваляюць міжнародныя законы, якія падпісала наша дзяржава. Ёсць такі дакумент, прыняты 10 лістапада 1994 г., Камітэтам міністраў Рады Еўропы, які завецца „Рамачнай канвенцыяй па ахове нацыянальных меншасцей", у якім гаворыцца пра правы нацыянальных меншасцей ды пра дзеянні, якіх нельга праводзіць супраць іх. І вось у 16-м артыкуле чытаем: „Strony powstrzymają się od stosowania środków zmieniających proporcje narodowościowe ludności, w rejonach zamieszkałych przez osoby należące do mniejszości narodowych. I mających na celu ograniczenie praw i wolności wynikających z zasad zawartych w niniejszej Konwencji ramowej". Ужо здаўна вядома, што няведанне законаў прыводзіць да пройгрышу. Шкада, што ад 1990 года не прыняты польскім Сеймам закон пра нацыянальныя меншасці ў Польшчы. Там павінны знайсціся і запісы пра сітуацыю вакол зямельнага пытання на этнічных тэрыторыях нацыянальных меншасцей. На практыцы значыць гэта, што ні левым, ні правым групоўкам не залежыць на забеспячэнні нашых інтарэсаў. Мы ім толькі патрэбны ў час выбарчых гонак у якасці галасоў, заплатай за якія ўсяго перадвыбарчыя абяцанкі. Але мы самі тут таксама не без віны. Ці войты, бурмістры, старасты і паслы, якіх мы выбіраем дзеля абароны нашых інтарэсаў, правялі абучэнні наконт правоў беларускай нацыянальнай меншасці ў польскіх і міжнародных законах? Мне пра такое невядома. І літаральна на мінулым тыдні пачуў я па радыё, што немагчымасць куплі зямлі ў аўкцыёнах карэннымі беларусамі занепакоіла пасла Яўгена Чыквіна. Абяцае ён у гэтай справе інтэрвенцыі ў міністра скарбу, якому падпарадкаваныя агенцтвы, у якіх маецца зямля; хоча таксама прадставіць гэтую праблему сеймавай камісіі нацыянальных меншасцей. Але ведаючы жыццё, можна сказаць, што без судовай дарогі тут не абыдзецца. У кожным выпадку, гэта апошні момант, калі можна яшчэ нешта зрабіць у гэтай справе. І калі беларускае асяроддзе ўмела гаварыць адным голасам у справе супрасльскага манастыра, супольна працавала ў карысць добрага выніку перапісу насельніцтва, то ў справе „быць ці не быць гаспадарамі на сваёй зямлі" — не можа быць разыходжанняў. Інакш чакае нас знікненне і праклён з боку гісторыі.

Яўген Вапа

Вяртанне прывіду „Бурага"

У тэлебачанні некалькі тыдняў таму паказалі дакументальны фільм Агнешкі Арнольд пра Рамуальда Райса „Бурага", забойцу амаль сотні мірных беларусаў, жыхароў Беласточчыны, зімой 1946 года. У фільме выступалі яго падначаленыя з Віленшчыны — салдаты Арміі Краёвай і з Беласточчыны — члены Нацыянальнага вайсковага згуртавання, якія, праўдападобна, прымалі ўдзел у пацыфікацыі беларускіх вёсак. Першыя злачынства называлі злачынствам, другія забойства жанчын, дзяцей і выпадковых людзей — змаганнем з камунізмам. Вазакоў, сведкаў злачыннага рэйду ў лютым 1946 г. нават не расстралялі, а забівалі памалу, з усімі праявамі садыстычнага адхілення, убіваючы ахвярам цвікі ў галаву, а камяні ў вочы.

У прэсе цалкам нядаўна з'явілася інфармацыя, што пракурор Дар'юш Альшэўскі з Інстытута нацыянальнай памяці канчае разглядаць справу „Бурага". Вынікі яго шматгадовага даследавання прывялі да высновы, што забойства фурманоў і пацыфікацыя вёсак былі ўчыненыя па нацыянальных прычынах. У 1996 г. Вайсковы суд Варшаўскай акругі прызнаў „Бурага" невінаватым, а беларускія ахвяры палічыў выпадковымі на дарозе патрыятычнай дзейнасці Рамуальда Райса. Пракурор Альшэўскі лічыць, што вайсковы суд мог прыняць такое рашэнне, таму што „Буры" змагаўся за найважнейшае — за незалежную Польшчу.

Высновы з вяртання прывіду „Бурага" вельмі сумныя. Установы правасуддзя дэмакратычнай краіны далі надта выразны сігнал, што можна апраўдаць кожнае злачынства, калі яно ўчыненае ў інтарэсе дзяржавы ці нацыі. Невядома аднак, якую сувязь з інтарэсамі краіны мела знішчэнне яе мірных грамадзян. Адказ на гэтае пытанне знайшоў вайсковы суд, які ўчыніў „Бурага" невінаватым рыцарам.

Яўген Мірановіч

Вачыма паляка

Пункт (прад)бачання раднай

Адзначалі мы нядаўна Сусветны дзень тэлебачання. Згодна з праведзенымі пры нагодзе аднымі з апытанняў аказалася, што палякі найбольш любяць французаў, італьянцаў ды амерыканцаў. Затое не — цыганоў, жыдоў, немцаў. Калі б уважліва паглядзець на тое даследаванне, то адносіны палякаў да беларусаў — ніякія. Яны ў ніжніх партыях на спіску сімпатый і антыпатый. Тым часам аказалася, што толькі кожны трэці паляк пагадзіўся б, каб у яго найбліжэйшай сям'і знайшлася асоба іншага чым каталіцкае веравызнанне. Вядома, датычыць гэта пэўнай паддоследнай групы, прадстаўнічай для ўсяе польскае папуляцыі, а не рэгіянальнай ці яшчэ больш вузкай, беластоцкай. Тут магло б быць інакш, асабліва ў Беластоку. Калі ўзяць пад увагу бесперапынныя спробы „абароны" нацыянальных і каталіцкіх каштоўнасцей кіруючых Беластокам, у першую чаргу Лігі польскіх сем'яў (LPR), выбраных жа ж ва ўсеагульных і дэмакратычных выбарах. У апошні час гарматы вывалаклі былі на бой супраць мастацтва, шанаванай ва ўсёй Польшчы і па-за яе межамі галерэі „Арсенал", гарадской установы, дзе паказвалі выставу „Сабака ў мастацтве". Кожнаму, здаецца, загаловак не навеяў бы думкі, што мастацкія працы, прысвечаныя чатырохногім, могуць стаць выдуманай прычынай для вядзення ідэалагічна-рэлігійна-палітычнай вайны. Аднак жа ж. Вядомая ўжо са змагання за каштоўнасці ў мастацтве (у сакавіку, пра што ўжо я пісаў, закідала працам Кацярыны Кажанецкай, выстаўленым у „Арсенале", распаўсюджванне парнаграфіі), беластоцкая радная Лігі польскіх сем'яў Бэата Антыпюк (якая штодзень займаецца тэрапеўтычнымі кансультацыямі для дзяцей) вывалакла свае гарматы супраць працы прэзентаванай у „Арсенале" — „Мне падарылі сабачку" Пятра Куркі, не абы-каго, а прарэктара Акадэміі мастацтваў у Познані. Праца спадара прарэктара гэта металёвая скрынка (будка) з сабачкам-цацкай і фатаграфіямі ксяндзоў.

— Гэта абражае мае рэлігійныя пачуцці. Фатаграфіі святароў паказваюцца ў такім месцы, дзе можна спадзявацца хваста! — грымела радная Антыпюк.

Куратар выставы Марэк Васілеўскі заступіўся за аўтарам:

— Рэакцыя раднай сведчыць аб невуцтве і памяшанні паняццяў. Сабака вылізвае раны, каб загаіліся, святар прапаведвае дабравесць, што спатольвае збалелае сэрца.

У „Кур'еры паранным" шэфіха „Арсенала" Моніка Шэўчык тлумачылася:

— Праца Пятра Куркі для мяне асабіста важная і каштоўная.

Зараз жа пасля гэтай дэкларацыі і пасля ўмяшання — на просьбу раднай — прэзідэнта Тура, усё ж, зняла працу з выставы. Калі пісаў я гэты тэкст, даведаўся, што ў сувязі з гэтым усе апошнія аўтары „Сабакі ў мастацтве" рашылі зрабіць тое ж.

І, вось, маем такую сітуацыю, дзе адна радная рашае аб тым, што беластачане маюць глядзець, накідае ім свае каштоўнасці, погляды, вопыты (хутчэй — іх недахоп) эстэтычныя і мастацкія. Прытым яна не знаўца мастацтва. Паддаецца гэтаму прэзідэнт горада, а, што найбольш сумнае, кіраўнік галерэі, якая, напэўна, угнецца пад ціскам цэнзарскіх парываў і кашмараў, што разбуджае атачэнне прэзідэнта Тура і сяброў „тэрапеўткі" Антыпюк. Жалюгодная справа.

Наконт пані раднай прыгадалася мне акрэсленне, якое скарыстаў Тамаш Налэнч, старшыня спецкамісіі па расследаванні г.зв. афёры Рывіна. Гэтак назваў ён адно са сцвярджэнняў былой віцэміністр культуры, сёння шэфіхі палітычнага кабінета прэм'ера, Аляксандры Якубоўскай:

— Гэта выключна пункт прадбачання пані міністр.

Як аказваецца, назіраючы здзек над галерэяй „Арсенал", пункты *przewidzenia* ці нават *przywidzenia* ў Беластоку — верхам.

Атака на „Арсенал" збеглася ў часе з іншай, такой жа спраўнай прэсавай тэмай — змаганнем гэтай самай правай фармацыі з новаадчыненым секс-шопам у цэнтры Беластока. Абурэнне з гэтай нагоды прэзідэнта Тура мусіць заставіць падумаць, паколькі мусіў ён, выказваючы сваю думку, ведаць, бачыць, што ў такой краме прадаецца, або, не дай Бог, намацальна сустрэцца з таварам у ёй прапанаваным. Прытым не перашкаджаў яму іншы секс-шоп, ужо гадамі (таксама за папярэдняй ягонай прэзідэнтуры), дзейнічаючы квартал далей. Як відаць, пачуццё прыстойнасці пана прэзідэнта — *wybiórcze*.

Хацеў я закончыць аптымістычна, вяртаючыся да мастацтва, звязанага нейкім чынам з нашым рэгіёнам. Паглядзеў, вось, я чарговы адрэзак польсатаўскага музычнага змагання маладых людзей — *Idola* і Маргарыту Карпюк з Гайнаўкі, якая ўвайшла ў фінальную дзесятку. Верныя чытачы „Вачэй", пэўна, памятаюць, як я за яе хварэў ад пачатку выдання гэтай праграмы. На жаль, Малгося ў адрэзку, дзе выконваліся клубныя песні, адсеялася. Вядома, шкада. Але, на маю думку, кар'ера перад ёю. Для мяне і так застанецца яна зоркай і надалей буду ейным фанатам.

Мацей Халадоўскі

Белавежа

Аб'явілі конкурс

Белавежскі асяродак культуры аб'яўляе конкурс для дзяцей і моладзі ва ўзросце ад 6 да 14 гадоў на найпрыгажэйшыя калядныя і навагоднія паштоўкі. Тэхніка прац адвольная. Паштоўкі трэба прынесці ў Гмінную публічную бібліятэку ў Белавежы да 19 снежня г.г.

23 снежня 2003 г. арганізатар наладзіць выстаўку найпрыгажэйшых і найбольш арыгінальных святочных паштовак у вестыбюлі мясцовага кіно „Зубр".

(яц)

Беласток

Сустрэча з кніжкай

12 снежня 2003 г. (пятніца) у Цэнтры праваслаўнай культуры ў Беластоку па вул. св. Мікалая 5, адбудзецца прэзентацыя кніжкі „Супрасльскай душы пяянне..." з удзелам аўтаркі Аляксандры Шавэла і перакладчыка — Віктара Шведа.

Вершы дэкламаваць будуць аўтарка і перакладчык пад гітару а. Дзмітрыя Тыханюка. У праграме вечара прадбачваецца выступленне архімандрыта а. Гаўрыіла з інфармацыяй аб бягучых патрэбах Супрасльскага манастыра.

Пачатак сустрэчы ў 17 гадзін.

Літаратурна-мастацкая старонка № 524

Адам Сяменчык

Кропля

(фрагмент)

і, вось, кропелька пачынае свой аповед
1
і тады закватаруюся ў хатцы з відам на
мяне мора.
і не будзе выхаду. заглыбішся ўва мне
альбо я ў табе
2
ува мне я. і ў табе я. значыць, тады, калі
ў табе
я — хто ты?
3
месяц — марскі прыліў. мяне больш. паўнею.
ноч мацнейшая ад мяне.
4
мне добра, калі я ў табе. можа табе
здавацца, што я трапячу, калі я па-за.
але гэта ўсё праз паверхневую напругу
5
у час апошняй сустрэчы частка мяне
засталася
на скуры іншай. таму мы сумуем. і не
здзіўляйся, што знойдзеш мяне ў куточках
тваіх вачэй. хачу вярнуцца да сябе!
6
урэшце дождж. у яго шматлікасці набіраю
іншага вымярэння.
забярэ мая соль, якая рэкамі сплывае ў мора.
астыне — каб грэць гейзеры
адблакітніцца, каб насыціць колерам неба
супакоіць пульсаванне — каб па землятрусе
зноў хтосьці чакаў
дажджу
7
не мусіш мяне нават кранаць. хопіць наша
цяпло, а
узлятаю. трэба толькі крыху цярплівасці,
канцэнтрацыі
пакіну табе іскрыстыя дробкі солі. калі іх
зліжаш, зноў
адчуеш смагу.
8
кранаеш мяне. адчуваю папілярныя лініі —
высахлыя сухарэччы якімі плыла я, калі ты
набіраў кшталтаў.
адчуваю маршчыны,
якія набіраюць глыбіні. кранаю цябе ўнутры.
вырысоўваю каньёны пачуццяў. дзе ты —
у моры мяне.
9
падаю
лячу
брыняю
цвярдзею
на хвіліну набіраю ідэальнага кшталту
і цяпер ведаю, дзе мой напрамак
10
раздумваеш ці ёсць іншыя падобныя да цябе
так цяжка знайсці тоесамага. а хопіць
глядзець
на дождж. колькі самотных кропель.
11
чым глыбей заглыбляеш карэнне ў хмары
мяне, тым бліжэй
будзеш да зямлі. а ведаючы аб ёй больш, яшчэ
глыбей
запусціш карэнне.
12
я запісвала свет у памяці частак. марозіла
мяне.
цяпер хопіць тваё цяпло, каб спазнаў сваю
гісторыю, схаваную
у мікраледавіку.
13
абагрэй мяне сваім цяплом. выпаўні.
а астыну — засні і
дазволь адысці. вярнуся гарачая.
14
дыхаю ціха, нячутна. і толькі звяры
заглядаюць табе ў вочы...

Пераклала з польскай Міра Лукша

Міра Лукша

Здаецца

Здаецца, гэта відаць, дзе ёсць словы і прасторы, якія імі запаўняюцца, а дзе толькі літаратура — літары ды знакі.

Гэта відаць, дзе ёсць эмоцыі, а дзе і калі іхны канец.

Гэта відаць, дзе даюць, каб з кімсьці падзяліцца, а дзе даюць міласціну і чакаюць, каб хтосьці гэта ўрэшце зразумеў.

Відаць і гэта, дзе хочуць, каб хтосьці жыў, а калі, каб сабе пайшоў. Нават у бок бяспамяці.

Часта мы існуем дзеля таго, бо нас выслалі, каб кагосьці перавесці на іншы бок. Каб адчуваў сябе бяспечным і меў надзею, што спакойныя тыя, хто застаўся. Не трэба толькі нікому нічога абяцаць. Таму, каго няма, мабыць, у сапраўднасці ўсё роўна, хіба што ёсць толькі адзін свет — думак, дзеянняў, прагі і таго, што мела быць альбо будзе.

Усё тое відаць адкрытым вокам, а тыя, хто бачыць больш, не заўсёды хочуць гаварыць. І не мусяць.

Паміж небам і зямлёй

Абязлюдзелыя краявіды, бачаныя з палёту птаха аказаліся ў альбоме вядомага беластоцкага фатаграфіка Пятра Савіцкага „Падляшша. Паміж небам і зямлёй". „Мастак, уздымаючы над зямлёй уласны зрух, запісвае прыгажосць чалавечага свету, маленькага латка польскай зямлі, адміністрацыйна якое называюць Падляшскім ваяводствам. Зямлі лагоднай (...). Падляшша запрашае, каб даваць надзею, што ўдасца знайсці маленькую частку нутра са страчанага Эдэму", — напісаў ва ўступе паэт Ян Леанчук, на штодзень дырэктар Ваяводскай падляшскай бібліятэкі.

У альбоме знаходзім 36 здымкаў з паўтары тысячы, якія выканаў Пётр Савіцкі ад 2000 года. Нялёгка рабілася падборка выдаўцу Андрэю Сакольскаму. Шмат з іх можна паглядзець на раскладных старонках.

У час прамоцыі альбома Пётр Савіцкі прызнаўся, што авіяфатаграфіяй займаецца ад 1978 года і адбыў больш за тысячу палётаў, дзякуючы перш за ўсё ветлівасці Памежнае стражы.

— Калі сядаю ў верталёт ці ў планёр, баюся заўсёды і поўныя порткі ў мяне, так сказаць, калі звісаю на паясах пад адкрытым самалётам. Але гэтае пачуццё непараўнальнае з нічым іншым. Адчуваю сябе як дзіця, — расказваў мастак.

Краявід на здымках бачым з розных узроўняў. У залежнасці ад вышыні палёту відаць альбо дэталі хаатычнага ва урбаністычным плане Беластока, альбо вымаляваныя Тварцом колеры падляшскіх лясоў, лугоў, палеткаў і рэк у адценнях чатырох пор года і святле кожнае пары дня. Увагу прыцягвае аколеная дрэвамі і быццам спецыяльна асветленая для патрэб фатографа сонцам на захадзе драўляная царкоўка ў Кажанах. Ян Леанчук так гэты вобраз пракаментаваў у свой паэтычны спосаб: „Да царквы ў Кажанах зляцеліся анёлы, малюючы святлом яе сцены, а кранаючыся званоў — склікаюць на малітву".

Агулам паказаліся ўжо тры выданні альбома, накладам у 4 тысячы. Адно з іх (1,5 тыс. экземпляраў) з прамацыйнай мэтай, дзякуючы спонсарам, заказала Падляшская маршалкоўская ўстанова. Прэзентацыі кнігі спадарожнічаў паказ здымкаў з яе, і то ў неканвенцыйным месцы — гіпермаркеце „Auchan". Чаму якраз там? Андрэй Сакольскі разважае:

— У традыцыйных беластоцкіх галерэях з творамі мастацтва, здаецца, не відаць залішняга тлуму. Хіба што хтосьці апранецца ў фрак са свінога трупа або зробіць падобны шэдэўр. Калі б мы, аднак, мелі публіку прыцягнуць да храмаў культуры, дарэчнай была б спроба выхаду з мастацтвам у месцы, якія з Музамі мала да сёння асацыяваліся.

Так вось, стомленыя „падарожжам" паміж таннейшымі чым у іншых месцах стравамі, у літаральным значэнні, людзі могуць хоць на хвілінку завесіць зрок, хоць бы на ўспомненай казачнай царкоўцы ў Кажанах, перапоўненай блакітам Гарадоцкай зямлі, поўных, як гэта акрэсліў Ян Леанчук, тугі дрэвах Белавежскай пушчы ці даліне ўючайся меандрамі Нарвы.

Альбом Пятра Савіцкага — веснік серыі розных публікацый, якія будуць паказвацца пад супольным лозунгам, якраз „Паміж небай і зямлёй". (мах)

Пад знакамі Арла і Пагоні

Гісторыя, можа быць, як рэдка якому іншаму народу, дала нам усе магчымыя адказы на якія хочаш варыянты свайго лёсу, — піша Сакрат Яновіч у заканчэнні сваёй новай кніжкі *Пад знакамі Арла і Пагоні**. Гэты зборнік сарака кароткіх фельетонаў, агучаных адзінаццаць гадоў таму ў Радыё Палёнія, прысвечаны польска-беларускім адносінам на працягу гісторыі. Ва ўступе аўтар напісаў: „Гэта не выклад гісторыі Беларусі, але вольны пераказ цікавейшых момантаў у фармаванні беларускай нацыянальнай свядомасці, культуры, таксама пад уплывам палякаў; менавіта — момантаў якія павінны зацікавіць Шаноўнага Чытача і заахвоціць да заглыблення ў родную мінуўшчыну".

Сакрат Яновіч пачынае ад пачатку польска-беларускіх літаратурных і, шырэй, культурных рэляцый у грамадскім і палітычным кантэксце, значыць, ад Сярэднявечча. Ад Вялікага княства Літоўскага і Польскай Кароны. Пераходзячы да чарговых этапаў нашых адносін, Яновіч прыгадвае тое, што можа і не ў смак артадаксійным палякам: „... Польская мова не толькі ў Сярэднявеччы, але і пасля, не мела рангу афіцыйнай". Шмат месца ў зборніку фельетонаў аўтар прысвячае росту беларускай свядомасці, які здзяйсняўся дзякуючы літаратурным творцам такім як Якуб Колас ці Максім Багдановіч і прэсы: „Грамады", „Нашай Долі" ці ўрэшце „Нашай Нівы". Акцэнтуе таксама праблему нарадзінаў беларускага нацыянальнага руху пачатку мінулага і канца XIX стагоддзяў, хоць, як дадае, гэта з'ява не да канца яшчэ даследавалася.

Пісьменнік і публіцыст з Крынак не баіцца таксама ўспомніць аб польскіх нацыянальных міфах, у кантэксце беларускіх чаканняў. Тут паяўляецца 1919 год і дзейнасць Юзафа Пілсудскага. „Узамен жа за надзею на моцнае плячо Польшчы, паўстаўшай да свабоды, беларускаму прадстаўніцтву не была аказана на практыцы ніякая адчувальная дапамога", — сцвярджае адназначна. І ацэньваючы сітуацыю гістарычна, зараз пасля даводзіць да высновы: „Памылкі Варшавы выкарыстаў Ленін, якому — у адрозненне ад Пілсудскага — настолькі нескладана было манеўраваць, што меў ён у руках дыктатарскую ўладу і катэгарычна, шмат не тлумачачы, прымусіў бальшавіцкі цэнтр узяцца за будаванне менавіта Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі". Але таксама падкрэсліў, паклікаючыся на тагачасную сітуацыю сярод інтэлектуальных эліт: „На жаль, намаганні перадавых палякаў не сустракаліся з належным водгукам з боку культурнай Беларусі. Трэба сказаць мацней: Мінск маўчаў, і толькі некаторыя асобы ў ім давалі прыватны сігнал, скажам, дружбы і любові".

Падагуленне „Пад знакамі Арла і Пагоні" скрываецца ў сцвярджэнні аднаго з апошніх раздзелаў, пад загалоўкам „Час": „Мы, беларусы, столькі стагоддзяў сумесна з палякамі пражылі ў адной дзяржаве, даўняй Рэчы Паспалітай Адобвух Народаў, маючы і пасля падобны лёс, каб у канцы дваццацівечча зусім адасобіцца — псіхалагічна і культурна".

Багата ілюстраваную графікамі ды здымкамі кнігу завяршае кароценькі тэкст: „Праблемы беларускага правапісу" Ніны Баршчэўскай, у якім тлумачыць яна, чаму кніга Сакрата Яновіча аддадзена ў рукі Чытачоў у класічным варыянце правапісу.

Добра, што радыёфельетоны Сакрата Яновіча адзінаццацігадовай даўнасці выдаліся ў кніжнай публікацыі. Радыё па сваёй натуры даходзіць да шырэйшай групы, чым літаратура (можа, у апошні час па-за чарговым версіямі „Гары Потэра"), аднак, думкі пераказваныя ў ім — улётныя. Дзякуючы спісанню іх маюць яны шанц „дайсці пад стрэхі" таксама і тых, хто павінен задумацца над генезісам, а затым сённяшнім і будучыняй польска-беларускіх адносін, а і тых, хто на сёння і заўтра гэтых адносін маюць уплыў.

(мах)

* Сакрат Яновіч, *Пад знакамі Арла і Пагоні*, Villa Sokrates, Крынкі 2003. Спонсар: Маршалкоўская ўправа Падляшскага ваяводства.

Зорка

старонка для дзяцей

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Ліцэісты з Аннай Бжазоўскай

Ліцэісты ў „Ніве”

Нядаўна, тыдзень у тыдзень, нас наведалі бельскія ліцэісты. Настаўніца беларускай мовы — Анна Бжазоўская — прыдумала класную ідэю. Яе навучэнцы наведалі рэдакцыю „Ніву”, Консульства Рэспублікі Беларусь і БГКТ. Жывое сутыкненне з месцамі пашырыла ўяўленне моладзі. Многія з іх упершыню завіталі ў нашу рэдакцыю. Тут на ўласныя вочы маглі пабачыць працэс узнікання газеты, пагутарыць з журналістамі, урэшце сфатаграфавацца на памятным здымку.

Нашы госці з захапленнем гарталі старыя гадавікі „Нівы”, асабліва гадавік калі яна нарадзілася.

На памятку жывой сустрэчы нашы госці атрымалі беларускія кніжкі, якія выдала Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.

ЗОРКА

Вершы Віктара Шведа

Навошта людзям столь?

Мухі расселіся на столі,
Тут адпачыць ім можна ўволю.
Ва ўмовах надта адмысловых
Адна з мух пачала размову:

— Людзей страшэнная дурнота
Мяне здзіўляе, не дзівота,
Бо грошы выдаюць на столі —
Не карыстаюць з іх ніколі.

Пужае чорная машына

Сустрэліся на панадворку
Два чорныя, як ноч, каты.
Адзін з іх адазваўся горка:
— Майго не зведаў суму ты.

Мяне чакае многа злога,
Надта збянтэжаны я тым,
Мне пераехала дарогу
Машына чорная зусім.

Данута БІЧЭЛЬ-ЗАГНЕТАВА

Лёгкія сняжынкі ў цішы...

Лёгкія сняжынкі ў цішы
Долу апускаюцца нясмела...
Светла ў полі, светла на душы...
Лёгкія сняжынкі ў цішы...

Спіць сасна ў бахматым шалашы,
А навокал так бялютка-бела...
Лёгкія сняжынкі ў цішы
Долу апускаюцца нясмела.

Якуб

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Якуб Філіпюк узорам многіх дэкламатараў падабраў верш пра здароўе. Як мы ўжо гаварылі раней, многія дэкламатары расказвалі пра лекараў і здароўе. Чаму гэтая тэма апынулася на першым месцы — невядома. Вядома толькі, што лясныя доктары, пра якіх распавёў нам Куба, найбольш выніковыя.

Дэкламатар з бельскай „тройкі” выступіў з творам Івана Муравейкі „Лясны доктар”. А ці здагадаліся вы ўжо сябры, пра якога доктара тут гаворка? Калі не, хадзіце на шпацыр у парк.

ЗОРКА

Пачуйце званочкі, людзі!

Усё хутчэй імчыцца цягнік. Бяжыць бясконцае кіно пейзажаў... Суседзі мае ўжо даўно спяць, яны не ведаюць, што мы патроху падымаемся ў неба. У чорнае, зорнае, глыбокае неба. Я гляджу і гляджу ўперад, але нічога не бачу, бо воблакі абкружылі нас. Яны нібыта пытаюцца: „Вы куды?” Але горды цягнік маўчыць і ляціць увысь.

Раптам пачуўся ціхі стук у дзверы. Я няспешна злезла з лаўкі і адчыніла.

— О, вы яшчэ не спіце? — гучна, нібыта спецыяльна, каб усіх разбудзіць, спытаў праваднік. Гэта быў хлопчык гадоў чатырнаццаці. Я адразу звярнула ўвагу на яго вочы — чорныя і дзіўна вялікія. Здавалася, што гэта два кавалачкі начнога неба.

— Цішэй, — шапнула я. — Разбудзіш усіх.

— А я правяраю, — ужо цішэй адказаў хлопчык, — ці ўсе яны спяць.

— Навошта?

— Каб яны не расчараваліся, што жыццё пражылі дарэмна.

Я нічога не зразумела і замаўчала. Зірнуўшы ў акно, я ўбачыла, што воблачкі зніклі і толькі вялізныя, нясцерпна бліскучыя зоры асляплялі неба. Але чамусьці святлей ад іх не рабілася.

— Чаму зоркі яркія, а святла ад іх няма? — спытала я ў хлопчыка.

— Ты заўсёды верыш толькі ў тое, што бачыш? — здзівіўся хлопчык.

— Не. Але ж звычайна, калі я бачу нешта бліскучае, то навокал становіцца светла, — адказала я і зноў зірнула яму ў вочы. Мне падалося, што хлопчык смяецца з мяне.

— Гэта не смешна, — пакрыўдзілася я.

— А я і не смяюся, — зусім сур'ёзна, нават залішне сур'ёзна прамовіў чарнавокі хлопчык.

— Ты хто? — не вытрымала я.

— А ты? — адказаў ён пытаннем на пытанне.

— Я першая спытала!

— А я апошні.

— Я — птушка, — пажартавала я.

— Я так і думаў. А я — хлопчык з Месяца. Няўжо мой твар не падаўся табе знаёмым?

Я паглядзела на яго твар. І сапраўды, я яго дзесьці бачыла! А потым мне чамусьці ўспомніўся сумны адзінокі Месяц. Так, гэта быў месяцаў твар...

— Я — яго сын. Я збег ад яго. Зірні на Месяц, у яго няма твару.

Міма праплыў Месяц. Ён здаваўся жоўтым, незвычайна вялікіх памераў пражэктарам. Хлопчык казаў праўду: твару ў Месяца не было.

— А чаму ты збег? — пацікавілася я.

— Мне надакучыла... Не! Мне стала жудасна, калі я падумаў, што магу пражыць жыццё дарма. Цяпер я свабодны, я маю крылы, як і ты, птушка.

— Ты паверыў, што я птушка? — засмяялася я. — Я не птушка, я — дзяўчынка.

— Не, ты птушка, — паматляў галавой хлопчык. — Ты — Птушка. Я гэта бачу ў тваіх вачах.

„Цікава”, — падумала я і вырашыла змяніць тэму гаворкі.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Замак у Крэве

Замкі Беларусі

— А, ці Крэва ў Літве? — пытае мяне пяцігадовая сяброўка. Яна толькі што агледзела руіны замка і пачула легенду пра князя Кейстута. Вялікі князь Кейстут — бацька Вітаўта, пераможцы з-пад Грунвальда. Якраз у Крэве, у выніку атруты, сканаў князь Кейстут.

— Калі ласка, гляньма найперш на карту Беларусі.

Мястэчка Крэва знаходзіцца ў паўночна-заходняй частцы Гродзенскай вобласці, на шляху Мінск — Вільня. Сваім выглядам і кліматам напамінае нашы Крынкі. Замак пабудаваны пасля 1333 года на насыпаным узгорку. Па сённяшні дзень захаваліся равы з вадою, што акаляюць руіны. Навокал замка таксама багонныя лугі. Крэпасць пабудавана на плане няправільнага чатырохвугольніка (85 х 108,5 х 71, 6 х 97,2 м), абнесена мураванымі сценамі таўшчынёю 2,65 м і вышынёй 12-13 метраў. Ніз замка з каменя, верх — абудаваны цэглай. Захаваліся руіны вежы, у якой быў заключаны і згублены Кейстут.

У Крэве людзі ветлівыя і цудоўна размаўляюць па-беларуску. Мястэчка з-за беднасці занядбанае, але цікавае археолагам, гісторыкам, мастакам і рыцарам. Дух і моц мінулага тут проста чароўныя.

Невыпадкова пачынаем ад геаграфіі. На ўроках гісторыі мы знаёмімся з Крэўскай уніяй, першай дамовай аб саюзе паміж дзяржавамі — беларуска-літоўскай і польскай. І чамусьці таксама думаем пра Літву.

— А як гэта зразумець? — глядзіць на мяне сяброўка:

— Проста. У часы, калі заключалася Крэўская унія, Беларусь называлася Вялікім княствам Літоўскім.

ЗОРКА

Пытанне: Калі і дзе была заключаная Крэўская унія?

Першыя чатыры асобы атрымаюць кніжныя ўзнагароды.

За адказ на пытанне ў „Зорцы" н-р 46 узнагароду — „Легенды" і каляровыя алоўкі, атрымоўвае **Агата Балтрамюк** з Дубін. Віншуем!

Польска-беларуская крыжаванка № 49

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 45: Джаз, явар, бот, калок, палена, князь, ар, воск, лістапад, араб, знахар. Яма, два, квіт, жак, нос, ар, пястун, казка, баль, пах, поле, ара, тона, дар, кара.

Узнагароды — запісныя кніжкі — выйгралі: **Анна Раманюк** са Старога Беразова, **Агата Балтрамюк**, **Паўліна Мялешка** і **Рафал Тамашук** з Дубін, **Паўліна Чурак** і **Марцін Мішчук** з Арэшкава, **Наталля Свірыдзюк** з Пасечнік-Вялікіх, **Агнешка Семянюк** і **Анджэліка Сельвясюк** з Бельска-Падляшскага. Віншуем!

Гульня ў дрындушкі

— А куды мы ляцім зараз?

— Я і сам не ведаю, адказаў хлопчык. Раптам я адчула, што цягнік пачынае тармазіць. Колы грукаталі ўсё павальней і павальней. Мы падышлі да акна. За акном ззяла сонейка, але ў купэ было па-ранейшаму цёмна. Па тратуарах, брукаваных каменнем, хадзілі людзі. Яны віталіся адно з адным і ўсміхаліся. Цягнуліся бесперапынныя крамкі, магазіны з бліскучымі шыльдамі.

— Тут мы ненадоўга, — сказаў хлопчык. Я, нібыта не чуючы яго, спытала:

— А як хоць цябе завуць?

— Муні, — зірнуўшы на мяне, адказаў хлопчык.

— Мяне заві Ні... — сабралася назвацца я, але Муні мяне перабіў:

— Птушкай, так?

— Ага, здзіўлена пагадзілася я.

Мы выйшлі з цягніка. Адразу ж вакол нас з'явіўся натоўп. Людзі наперабой віталіся з намі: „Дзень добры!", „Дзень добры!.." Я толькі стаяла і ўсміхалася. А потым людзі зніклі. Засталася пустая маўклівая вуліца.

— Хадзем! — паклікаў мяне Муні.

Мы падышлі з ім да нейкай крамкі, на якой не было ні надпісаў, ні шыльдачак. І ўвогуле, у параўнанні з іншымі яна выглядала нейкай закінутай.

— Навошта мы сюды ідзём? — не стрымалася я.

— А чаму б нам сюды і не зайсці? — адказаў хлопчык. „Магла ўжо і здагадацца, як ён адкажа!" — падумала я, але ўсё ж пайшла за Муні.

— Не бойся, Птушка! — нарэшце хоць штосьці Муні прамовіў не пытаючыся.

Грукнулі дзверы, і мы апынуліся ў маленькім пакойчыку. На паліцах тут стаялі розныя званочкі: срэбныя, залатыя, цагляныя, фарфоравыя, крыштальныя, вялікія і маленькія...

Нечакана перад намі з'явіўся невялікага росту дзядок з беласнежнай барадой да пояса. На яго доўгім носе блішчалі акуляры ў залацістай аправе.

— Што трэба выбраць маладым людзям? — запытаўся дзядок. Голас у яго быў зусім не стары, а нават нейкі дзіцячы. — А-а, ведаю, ведаю... — тут жа дадаў ён і падышоў да нас. — Усё падрыхтавана.

Гэтае „ўсё падрыхтавана" ён прамовіў такім змоўніцкім тонам, што мне нават зрабілася смешна.

Раптоўна пакойчык прапаў... Вакол ішла вайна, раз за разам грымелі выбухі, беглі салдаты, плакалі дзеці... Стала цяжка дыхаць...

Гэтак жа нечакана ўвесь гэты жах знік, мы апынуліся ў царкве. Тут было спакойна і ўтульна. Усё патанала ў загадкавым святле свечак. Чамусьці з болем і жалем у вачах глядзелі на нас з абразоў святыя...

Раптам — голае поле... Усё агароджана калючым дротам. Адразу ж у вочы кінуўся знак радыяцыі...

Я закрыла твар рукамі. Мне было страшна, рукі і ногі трэсліся, але ў гэты час я адчула прыемную лёгкасць. За спінай у мяне раслі крылы... Муні ўзяў мяне за руку. Я паглядзела на яго. За спінай у хлопчыка таксама былі крылы. Белыя. Чыстыя...

У маёй правай руцэ ззяў срэбны званочак.

— Званіце, дзе бяда. Званіце гучней, каб чулі, — звярнуўся да нас дзядок і знік. А мы паляцелі туды, дзе нас чакалі...

Пачуйце званочкі, людзі!

Ніна МЯЦЕЛЬСКАЯ, Мінск, СШ № 126

Гульня ў дрындушкі з'яўляецца качаннем абруча паводле маятнікавай эстафеты (sztafety wahadłowej) на час.

Каманда можа складацца з шасці ганцоў (тры дзяўчыны і трох хлапцоў), якія стаяць насупраць сябе ў адлегласці 18 метраў. На старце стаяць хлопцы. Дзяўчаты на супрацьлеглым баку. Першы спаборнік за лініяй старту трымае абруч і кіёк. На сігнал ён пачынае каціць абруч у напрамку сяброўкі. Калі ён зраўняецца з лініяй дзяўчыны і перасячэ лінію, тады перадае абруч і кій сяброўцы. Дзяўчына коціць абруч да чарговага хлапца і г.д. Важны тут час выканання задачы камандай. Выйгрыш па баку тых, хто найхутчэй зноў перасячэ лінію старту.

Паспрабуйце гульні на ўроку фізкультуры або пасля заняткаў, у сяброўскім крузе.

ЗОРКА

Хросныя бацькі „Перапёлкі": Ірэна Сегень і Міраслаў Мордань

Танец „Прывітальная" ў выкананні ансамбля „Спадчына" з Пружан

Юбілейны канцэрт „Перапёлкі"

У суботу, 15 лістапада г.г., у Гайнаўскім доме культуры адбыўся юбілейны канцэрт, прымеркаваны да дзесяцігоддзя тамашняга Ансамбля народнага танца. Урачыстасць адкрыў дырэктар ГДК Андрэй Скепка, які адзначыў, што ўзрастае цікавасць да народнай творчасці і нацыянальнай культуры, у тым ліку і беларускай. Шматлікая публіка ў чарговы раз атрымала магчымасць пазнаёміцца з народнымі польскімі, беларускімі, украінскімі і рускімі танцамі.

У гэты святочны вечар ансамблю было прысвоена імя „Перапёлка". Хроснымі бацькамі былі Ірэна Сегень і Міраслаў Мордань, а патранат над ансамблем узяў Гайнаўскі малочны кааператыў. Ганаровае месца ў праграме юбілейнага мерапрыемства выпала беларускаму ансамблю „Спадчына" з Пружан.

Трэба заўважыць, што не было б гэтага свята, калі б дзесяць гадоў раней заснавальніца ансамбля Анна Баран не згуртавала вакол добрай і цікавай справы здольнай моладзі з гайнаўскіх сярэдніх школ і гімназій. Мы як сёстры і браты, гавораць танцоры, сумуем без сябе і жывем чаканнем новых сустрэч. Вялікая сіла ў гэтага ансамбля!

Юбілейная ўрачыстасць доўжылася амаль чатыры гадзіны і публіка атрымала многа станоўчых уражанняў. Бадзёрыя танцы ў выкананні нашай прыгожай моладзі нікога не пакінулі раўнадушным. Гэтае мерапрыемства дало кожнаму з нас аснову для задумы пра свой радавод ды павінна стаць штуршком да станоўчага дзеяння — каб жылося нам лепш.

— Паглядзіш на такіх людзей, паслухаеш іх, — сказала ў час канцэрта мая суседка ў глядзельнай зале, — і нанава палюбіш сваё роднае.

Прагучала шмат добрых і цёплых слоў у адрас калектыву, а яго заснавальніца Анна Баран атрымала багата букетаў кветак і падарункаў. Віншавалі ёй м.інш. гайнаўскі віцэ-староста Ежы Сірак, бурмістр Анатоль Ахрыцюк, войт Вольга Рыгаровіч, консул РБ у Беластоку Леанід Каравайка, сакратар ГП БГКТ Валянціна Ласкевіч, дырэктар ВААК Анджэй Дырдал, дэлегацыя Дома культуры з Вышкава, дэлегацыі ад гайнаўскіх школ і прадшколляў ды шматлікія іншыя госці.

* * *

Госцем юбілейнага канцэрта ў Гайнаўцы быў Народны ансамбль танца „Спадчына" з Пружан. Расказаць пра гэты калектыў я папрасіў яго кіраўніка Валянціну Іскалеву.

— Ансамбль „Спадчына" быў заснаваны ў 1979 годзе, а я кірую ім з 1981 года. У 1991 годзе ансамблю было прысвоена званне „Народны". За гады сваёй творчай дзейнасці калектыў заваяваў шырокую вядомасць і папулярнасць у гледачоў. Ён прымае ўдзел у шматлікіх мерапрыемствах, ладжаных гарадскім Домам культуры і часта выступае на іншых сцэнах Рэспублікі.

„Спадчына" з'яўляецца дыпламантам розных фестываляў і конкурсаў: Фестывалю самадзейнай творчасці Міністэрства радыёэлектроннай прамысловасці СССР (Масква, 1986 г.), абласнога свята харэаграфічных калектываў „Палескія ўзоры" (Брэст, 1991 г.), Рэспубліканскага фестывалю самадзейнай творчасці прымеркаванаму да 50-годдзя Перамогі (Мінск, 1995 г.), Фестывалю народнай творчасці „Беларусь — мая песня" (1998 г.). Калектыў ездзіў на гастролі ў Чэхаславакію (1984 г.), Балгарыю (1986 г.) і Іспанію (1988 г.).

Членамі калектыву з'яўляюцца рабочыя, служачыя, педагогі, навучэнцы школ і аграрна-тэхнічнага каледжа. Пры Народным ансамблі танца „Спадчына" пастаянна працуе падрыхтоўчая група, дзе практыкуюцца дзеці ва ўзросце 7-14 гадоў. У калектыве займаецца і ўся мая сям'я.

Рэпертуар ансамбля складаюць беларускія народныя танцы: „Прывітальная", дзявочы карагод „Рэчанька", „Пружанскія гульні", „Вясеннія пераскокі", „Крутуха", „На гулянні", „Палеская кадрыль". У праграме калектыву маем танцы іншых народаў, у іх ліку рускія і ўкраінскія. Публіка вельмі цёпла ўспрымае харэаграфічныя кампазіцыі на гістарычныя тэмы: „Пагоня" і „Памяць".

У 2001 годзе пачалося супрацоўніцтва з Ансамблем народнага танца Гайнаўскага дома культуры, якім кіруе Анна Баран. У выніку гэтага супрацоўніцтва ў рэпертуары „Спадчыны" з'явіўся польскі танец „Паланез", а ў Гайнаўцы — беларускія „Крутуха" і „Мітусь". У маі г.г. адбылася доўгачаканая сустрэча калектываў на беларускай зямлі, дзе адбылося некалькі супольных канцэртаў.

За падтрымку арганізацыі сустрэч нашых калектываў хачу падзякаваць кіраўніцтву Гайнаўскага дома культуры і асабіста Анне Баран. Хачу таксама падзякаваць супрацоўнікам Консульства Рэчы Паспалітай у Брэсце, асабліва Генеральнаму консулу спадарыні Аліне Чарняўскай за дапамогу нашаму калектыву. Спадзяюся, што першая творчая сустрэча на польскай зямлі дасць добры плён і натхніць калектывы да новых сумесных праектаў і сустрэч.

Віктар Бура

Гісторыя вачыма нявольнікаў

„Дзе быў свабодны чалавек, там быў і раб", — сцвярджае Юры Весялкоўскі, беларускі эміграцыйны гісторык і публіцыст у сваёй самай новай кнізе *Рабы ў старажытным і сучасным сьвеце** (с. 6).

Кніга складаецца з чатырох дзесяткаў нарысаў пра грамадскія адносіны ад старажытных Месапатаміі, Індыі і Кітая, праз больш нам блізкія: Егіпет, Грэцыю і Рым да ўзнікнення наважытных дзяржаў у Еўропе, якія накінулі астатняй частцы свету каланіялізм і рабства.

Найбольш увагі аўтар адводзіць Расіі, якая апошнія чатыры стагоддзі мела непасрэдны ўплыў на тое, што тварылася на беларускіх землях. Нават, калі існавала яшчэ Вялікае княства Літоўскае. Вось, для прыкладу, як паводзілі сябе войскі цара Аляксея Міхайлавіча ў вайне з Рэччу Паспалітай у 1654-67 гадах: „Нават з цэркваў вывозілі каляровыя металы і шмат рознага дабра. Забіралі жывёлу і вывезлі сотні тысяч беларусаў у Расію, дзе іх



выкарыстоўвалі ў розных галінах навукі і будаўніцтва" (с. 181). А ў Беларусі пачалося тое, што заўсёды спадарожнічае войнам: голад, хваробы, заняпад гаспадаркі. І падумаць, што да гэтай вайны спрычыніліся самі беларусы і ўкраінцы, паўстаючы супраць дамінацыі Польшчы, Каталіцкага касцёла, магнатэрыі. Уцякаючы ад езуітаў, якіх Юры Весялкоўскі вельмі не любіць і празмерна дэманізуе (уплыў расійскай, а пасля савецкай гістарычнай навукі), трапілі ў лапы краіны з „таталітарнымі правамі" (с. 182).

На шчасце, хацелася б сказаць, прыгонніцтва, рабства, эксплуатацыя чалавека чалавекам засталіся ў мінулым. Цяпер жа валадараць: дэмакратыя, свабода, Дэкларацыя правоў чалавека, міжнародныя трыбуналы і суды, якія заступяцца за простым грамадзянінам. І тут Юры Весялкоўскі расчаруе аптымістаў. Не было б пералічаных устаноў і прававых актаў, каб не было ў свеце прыгнёту і несправядлівасці. Вось толькі некаторыя прыклады: „... з сярэдзіны 1970-х да пачатку 1990-х гадоў на ўсім сьвеце было прададзена 30 мільёнаў жанчын (...), дзеці ад пяці гадоў працуюць у неадпаведных для здароўя варунках. Робяцца і такія злачынствы ў некаторых дзяржавах, што маладых хлапцоў, якія не маюць яшчэ 10 гадоў, выкарыстоўваюць у ваенных канфліктах" (с. 265).

Свае разважанні (абапертыя на салідную літаратуру) аб гісторыі чалавецтва з пункту гледжання тых, хто заўсёды займаў самую нізкую прыступку ў грамадскай іерархіі, Юры Весялкоўскі канчае сумным сцвярджэннем: „Нягледзячы на ўсе міжнародныя захады па выкараненні рабства, дасягнуць поўную свабоду для ўсіх людзей не ўдаецца. Такое жаданне як было, так і застаецца марай" (с. 266).

Ці не таму так дзеецца, што рабства не чалавек прыдумаў? У „Святым пісанні" (кніга „Выхад", раздзел дваццаты; пераклад Васіля Сёмухі) чытаем: „Не прагні дому блізкага твайго; не прагні жонкі блізкага твайго, ні раба ягонага, ні рабыні ягонай, ні вала ягонага, ні асла ягонага, нічога, што ў блізкага твайго".

Мікола Ваўранюк

* Юры Весялкоўскі, *Рабы ў старажытным і сучасным сьвеце*, сс. 270, Беласток-Лёндан 2003.

Урок патрыятызму

Семнаццатага лістапада ў школу ў Аўгустове, што каля Бельска, завітаў адстаўны капітан Стэфан Вежба з Кракава. Не было б у гэтым нічога дзіўнага, каб не тэма спаткання капітана з гімназістамі і вучнямі пачатковай школы.

Стэфан Вежба ездзіць па ўсёй краіне з праграмай „Падыміся, Айчына", прапагандуючай патрыятызм сярод маладога пакалення. Аднак спосаб прапагандавання здзівіў настаўнікаў і перапалохаў большасць вучняў.

Пасля абеду спартыўны зал запоўніўся моладдзю, якая з ахвотай чакала „нейкага" спектакля (вядома, лепш нешта паглядзець, чым ісці на ўрок). Раптам у залу маршавым крокам пад камандай Стэфана Вежбы ўвайшоў пераадзеты ў мундзіры студзеньскіх паўстанцаў атрад гімназістаў. Са стрэльбамі, праваслаўным і каталіцкім крыжамі, вялікім боханам хлеба і ліхтаром у руках па камандзе капітана аддалі чэсць дырэктару школы, прывіталі настаўнікаў і сяброў.

Усё было б нармальна, каб не спосаб, у які праведзены быў урок патрыятызму.

Стэфан Вежба не падумаў хіба, што спектакль будуць глядзець дзеці і моладзь ва ўзросце 9-15 гадоў, якім слова Айчына, гонар і армія спалучаюцца з урокамі гісторыі, а не з сучаснасцю. Здзіўленне выклікаў таксама факт, што капітан не патрапіў звяртацца да вучняў спакойным, а не павышаным голасам. Найлепшым прыкладам было здарэнне, калі аблаяў аднаго хлопца за тое, што той засмяяўся, пабачыўшы свайго сябру ў надта вялікім мундзіры паўстанца і красоўках-адыдасах. Пералякаўся не толькі гэты вучань...

Акцёры з прымусу, бо так можна назваць выступаючых у спектаклі вучняў, стоячы пад знакам літоўскай Пагоні, белым Арлом і Мадоннай на чорным фоне на каманду капітана хорам выгуквалі: „Wiwat, Polonia!" Захапленне, чаканага спадаром Вежбай, не выклікалі нават патрыятычныя вершы, лепш сказаць заклікі ў вершаванай форме, скіраваныя да вучняў аўтарства самога капітана, тыпу: „Я, сын Бельскай зямлі, заклікаю вас, браты! Падыміцеся на барацьбу за Айчыну душы студзеньскіх паўстанцаў! Улійма ў сэрцы маладых патрыётаў са школы ў Аўгустове талісман любоўі да Айчыны!"...

Цікавым падаўся адказ на пытанне: чым з'яўляецца Айчына? Аказалася, што Айчына — гэта перш за ўсё ксёндз, школа, дырэктар і родная вёска... Мяне не пераконвае такое тлумачэнне, наадварот, адпіхае. А як адрэагавалі дзеці? Не былі яны так задаволены, як на пачатку спектакля, бо хто б падумаў, што прыйдзецца ім спяваць гімн і адаваць чэсць дырэктару, ксяндзу (на жаль, у гэты дзень не было ў школе бацюшкі, бо тады праваслаўныя, якія ў школе складаюць большасць, адчувалі б інакш пампезнасць цырымоніі).

Пасля такога спектакля ўзнікаюць пытанні. Па-першае, адкуль бяруцца ўра-патрыёты, якія не ўмеюць наладзіць кантакт з моладдзю. А па-другое, ці ў цяперашні час такія спектаклі маюць хаця б невялікі ўплыў на станаўленне пачуцця любові да Айчыны. Адказы простыя. На ўсім можна зарабіць, нават на патрыятызме (кожны вучань заплаціў па два злоты).

Паўліна Шафран-Асташэвіч

Як трэба жыць?

Гайнаўскі Дэканальны інстытут праваслаўнай культуры разам з Праваслаўным брацтвам св.св. Кірылы і Мяфодзія арганізавалі 3 лістапада ў Гайнаўскім доме культуры спатканне з архіепіскапам Вроцлаўскім і Шчэцінскім Іерэміяй. У верасні гэтага года мінула 20 гадоў ад хіратоніі архіепіскапа. Ад многіх гадоў з'яўляецца ён выкладчыкам Хрысціянскай тэалагічнай акадэміі ў Варшаве, а некалькі гадоў быў яе рэктарам. Ад 2002 года ўзначальвае Польскую экуменічную раду. У Гайнаўцы выступіў з дакладам „Вобраз жыцця хрысціяніна на аснове Лістоў апостала Паўла". На спатканне прыбылі святары і вернікі, а ў іх ліку бурмістр Анатоль Ахрыцюк, войт Гайнаўскай гміны Вольга Рыгаровіч і радныя Гайнаўшчыны.

— Розум наш, з-за грахоў, няздольны да правільнага мыслення, а Лісты апостала Паўла вучаць, як трэба жыць. Без дапамогі Святога Духа мы не можам убачыць свет такім, якім ён ёсць сапраўды. Бачым толькі такую рэчаіснасць, якую навучылі нас бачыць людзі, або якую мы самі хочам бачыць. Трэба ўвесь час жыць згодна з воляй Божай, — адзначыў уладыка Іерэмія. — Грэх так дзейнічае на нас, што найчасцей не робім тое, што хочам, але займаемся тым, чаго ненавідзім.

Апостал Павел навучаў, што трэба пазбягаць грахоўных паводзін, не нервавацца і прабачаць іншым людзям, калі тыя нас пакрыўдзяць. Калі загневаемся на іншую асобу, то да захаду сонца трэба прабачыць ёй. Апостал Павел не крытыкаваў нявольніцтва, але навучаў, што сярод хрысціян не павінна быць рабоў. Заклікаў ён дзяцей, каб слухаліся сваіх бацькоў, а родзічам прапанаваў не злосціць, без патрэбы, сваіх дзяцей.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Архіепіскап Вроцлаўскі і Шчэцінскі Іерэмія

Епіскап Іерэмія сказаў, што самыя лепшыя каментарыі да Евангелля — апрацаванні св. Іаана Златавуснага. Працу рускіх багасловаў перарвала рэвалюцыя і толькі ад нядаўняга часу ў Расіі пачаліся работы над каментарыямі да Евангелляў.

Пасля даклада сабраныя пыталі архіепіскапа Іерэмію пра патрэбу прыкрывання галавы жанчыне, якая ўваходзіць у царкву. Уладыка прачытаў фрагмент з Паслання апостала Паўла, дзе сказана, што прыкрыванне галавы з'яўляецца праявам пакорлівасці жанчыны ў адносінах да мужа. Таксама і старая традыцыя наказвае накрываць галаву ў час малітваў.

— У нашым жыцці сустракаем вялікае варварства, таму што раней мала гаварылі пра Бога і не чыталі Евангелля, — адзначыў епіскап. Сярод праваслаўных у Польшчы, а асабліва на Беласточчыне, панізіўся ўзровень духовага жыцця. Мала жыхароў вёсак ходзіць у цэрквы, многія моляцца машынальна. Лічаць яны, што Бог павінен слухаць нашыя просьбы і даваць паводле просьбаў.

Аляксей Мароз

Конкурс на адкрытку

Гмінны цэнтр культуры ў Міхалове аб'явіў пластычны конкурс на святочную паштоўку (Каляды і Новы год). Могуць у ім удзельнічаць вучні рознага тыпу школ з тэрыторыі Міхалоўскай гміны.

Адкрыткі могуць быць нарысаваны адвольнай пластычнай тэхнікай. Колькасць прац неабмежаваная.

Паштоўкі будзе ацэньваць журы, беручы пад увагу тры ўзроставыя групы: пачатковыя школы, гімназіі і сярэднія школы. Адкрыткі трэба прынесці ў ГЦК у Міхалове, вул. Беластоцкая 19, да 14 снежня г.г. Прыймае іх інструктарка пластыкі Малгажата Тарасевіч.

Уручэнне ўзнагарод і вылучэнняў адбудзецца 19 снежня 2003 года. (яц)

Конкурс пра Нараўчанскую зямлю

Таварыства сяброў Нараўчанскай зямлі запрашае да ўдзелу ў конкурсе на тэмы: „Нараўчанская зямля — мінулае, сучаснасць, будучыня", „Мая сувязь з Нараўчанскай зямлёй" ды „Нараўчанская зямля перад уваходам у Еўрасаюз". Можна прыслаць нарыс, рэпартаж, хроніку або фотаграм, да 31 студзеня 2004 года ў Гмінны асяродак культуры ў Нараўцы, па вул. Новай 3 А, з прыпіскай на канверце „Конкурс". Падсумаванне конкурсу 1 сакавіка 2004 года. За дэталёвай інфармацыяй можна звяртацца па тэлефоне 685-80-34 ад гадзіны 10 да 18. (яц)

Запіскі з горада на Няве

На Палацавай плошчы

У той дзень, калі мы ў суправаджэнні мясцовай пенсіянеркі Тамары Пунчанкі наведалі Эрмітаж, у 19 кварталах Санкт-Пецярбурга адбывалася многа мерапрыемстваў, прымеркаваных да 300-годдзя горада. Народныя гулянні звабілі людзей і без большых праблем удалося нам наведаць Эрмітаж, значыць, Зімні палац і прымыкаючыя да яго чатыры будынкі, састаўляючыя музейны комплекс на Палацовай плошчы. У ім у звыш 1 050 залах паказваюцца 2 мільёны 600 тысяч прыкладаў сусветнага мастацтва. Тры з паловай гадзіны, бо столькі засталося часу да закрыцця музея, захапляліся мы карцінамі Леанарда да Вінчы, Рафаэля, Тыцыяна, Рубенса, Рэмбрандта і іншых тварцоў. Аддзел заходнееўрапейскага мастацтва налічвае каля 8 тысяч карцін, 40 тысяч рысункаў і больш за паўмільёна гравюр, а таксама багацейшыя калекцыі скульптуры. Пабывалі мы таксама ў залах калекцыі карцін, звязаных з панаваннем імператарскага роду Раманавых. Аб уражаннях ад пабачанага ў музеі немагчыма расказаць, проста трэба ў ім пабываць. Выйшаўшы з Эрмітажа, затрымаліся мы на Палацавай плошчы з велічыннай Аляксандраўскай калонай пасярэдзіне, прысвечанай рускім перамогам у Айчыннай вайне 1812 года. Гранітны абеліск (вышыня стрыжня — 25,58 м, а фігура анёла на ім — 6,4 м) з'яўляецца маналітным каменем вагою больш за 600 тон. З вялікімі цяжкасцямі маналіт быў дастаўлены ў Санкт-Пецярбург. Пры яго выламе і дастаўцы з Фінскага заліва ўдзельнічала 2 тысячы салдат і 400 рабочых. А дзеялася гэта ўсё пад кіраўніцтвам селяніна з Валагодскай вобласці С. Калодкіна. А ўсімі работамі звязанымі з устанаўленнем маналітнага каменя кіраваў самавук 20-гадовы юнак Васіль Якаўлеў. Аляксандраўскую калону адкрылі 30 жніўня 1834 года.

Ісакіеўская плошча

Быць у Санкт-Пецярбургу і не пабываць у Ісакіеўскім саборы — вялікая страта.

Адно з самых грандыёзных збудаванняў горада ўзводзілі на працягу 40 гадоў (1818-1858) па праекце архітэктара А. Манферана. Паражаюць размеры сабора вышынёю ў 101,5 м. Змяшчаецца ў ім 14 тысяч чалавек. Афармлены сабор 112 паліраванымі, гранітнымі калонамі. Фасады сабора ды інтэр'ер багата дэкараваны скульптурай і барэльефамі. Да ўнутранага аздаблення выкарыстаны каштоўныя камяні і шматлікія дэталі адлітыя з бронзы і вызалачаныя, жывапісныя і мазаічныя карціны з евангельскай тэматыкай. Вялікая колькасць ікон на сценах, а таксама іканастасы і прыгажосць райскіх дзвярэй напаўняюць чалавека асабліва глыбокімі пачуццямі. Камуністычная ўлада закрыла сабор у 1928 годзе і ператварыла яго ў музей. Сабор знаходзіцца на Ісакіеўскай плошчы, пасярэдзіне якой пастаўлены помнік цару Мікалаю I.

Медны яздок

Ужо здалёк прыкаваў наш зрок бронзавы Медны яздок (так помнік назваў Пушкін). На ўздыбленым кані сядзіць імператар Пётр I з горда паднесенай галавой. Гледзячы на фігуру, адчуваецца сіла і энергія дзяржаўнага дзеяча і рэфарматара.

Цокалем для помніка паслужыў гіганцкі гранітны маналіт (Гром-камень яго называлі) вагой 1 600 тон. На помнік пайшло 10 пудоў бронзы і амаль 50 пудоў жалеза залітага для ўстойлівасці задніх ног каня. Дэталь у выглядзе змяі сімвалізуе растаптанага конскімі капытамі ворага і адначасова служыць трэцім пунктам апоры коннай статуі. Падзіваваліся мы гэтаму шэдэўру і згодна сцвердзілі, што толькі бачыць на здымку Меднага ездака і не быць каля яго, гэта мала, гэта далёка не тое адчуванне.

Міхась Хмялеўскі

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Хата ў Лешчанах, пастаўленая Ільём Клімовічам

Па слядах прарока(1)

У Лешчаны выбраўся я дабірацца з Шаціл. Ад жвіроўкі, што ад Нетупы вядзе праз лес на поўнач, два разы падаваўся ў адыходныя дарогі ўлева. Раз дарога прапала, а за другім разам выйшаў на нейкі панадворак, гаспадыня якога не ўмела мне сказаць, як у Лешчаны трапіць. І толькі за трэцім разам каля расхадных дарог пажылая жанчына, якая выйшла разглянуцца за грыбамі, паказала мне дарогу ў патрэбную мне вёску.

Было гэта ў цёплы сёлета верасень і Лешчаны здавалася паглынаць прырода. Вёсачка рабіла ўражанне, быццам праз яе прайшло *powietrze*. Удалося мне ўбачыць жывую душу, мужчыну, ад якога пашанцавала мне даведацца, дзе солтысава хата.

Солтыса дома не было. Жонка паведаміла, што ён скошвае старую траву, якой каровы не выелі; паказала мне тое месца. Калі я набуваў боты, яна папракнула мяне:

— Навошта вы разбуваліся? Каб мне больш гэтага не рабілі!

Солтыс Юзаф Мірон ахвотна адхіліўся ад касьбы да гутаркі.

— Калісь, зараз пасля вайны, — сказаў, — у Лешчанах у пяцідзесяці хатах жыло 30 праваслаўных сем'яў (180 душ) і 20 каталіцкіх (120 душ), а сёння жыве тут 4 праваслаўныя асобы і 22 каталікоў. Найстарэйшая жанчына з 1916 года, а наймалодшаму дзіцяці ў шасціасабовай сям'і пяць гадоў. Пасля вайны трынаццаць сем'яў выехалі ў СССР, а дзве адтуль прыехалі. Пасля людзі выязджалі, галоўным чынам у Беласток; ехалі таксама і ў іншыя гарады, у пэгээры, у шахты; напрыклад, траіх братоў Валошыных выехалі ў Сілезію.

— А што гэта за хата, — спытаў я, — у якой тры акны ў шчытавой сцяне, як у Расіі?

Гэта Ілья Клімовіч паставіў: майстроў наняў і збудаваў, — пачаў расказ Юзаф Мірон. — І жыў там, калі ў выніку канфлікту з духавенствам пакінуў Грыбоўшчыну. Ён тады царкву ў Грыбоўшчыне на касцёл аддаў; каталікі не хацелі браць, але ён упрасіў. Зараз сам пачаў ставіць недалёка адсюль, у Вершаліне, новую царкву. Дом там пабудаваў, і хлеў, і стадолу. І шпіталь ад сухотаў хацеў паставіць: пабудаваў падмурак і лекара згадзіў — Антона Доху, які ў Жуховічах каля Гродна жыў, а пасля вайны ў Кузніцы і Саколцы. У той вось хаце жыў Ілья да вайны, а пасля вайны зрабілі там школу-чатырохгодку. Школа існавала недзе да 1980 года і прыходзілі сюды дзеці са Студзёнкі, Старой і Новай Грыбоўшчыны, Халодных Валокаў і Лешчан. Пасля заканчэння нашай чатырохгодкі далей дзеці ішлі вучыцца ў Нетупу або Шацілы, бо там школа была ў некалькіх прыватных хатах то ў адной, то ў другой вёсцы. Гаварылася, што туды хадзілі дзеці з двух паветаў і трох гмін: Гарадоцкай (Юзэфова), Крынскай (Саннікі) і Шудзялаўскай (тады Нетупа, Шацілы, Лешчаны і інш.); напр. разам са мною вучылася дваіх хлопцаў і пяць дзяўчат з Юзэфова.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Юзаф Мірон

Было праваслаўнае свята, Спленне бадай. Мая мама жала (яна выводзілася з каталіцкай сям'і), а бацька сядзеў у цянёчку (ён быў з праваслаўнай сям'і). Прыйшоў Ілья, выняў з кішэні некалькі груш і мне ў шапку паклаў. Я пабег да мамы:

— Мне Ілья грушаў даў! — хвалюся.

— Трэба гаварыць „дзядзька", — павучыла мяне мама.

Калі ў 1930 годзе ўпала польская ўлада, а саветаў яшчэ не было, тады была свабода ў лесе і кожны мог сячы колькі хацеў. Наш прыватны лес межаваў з дзяржаўным і бацька хадзіў пільнаваць свайго. Сядзеў раз бацька ў лесе і ўбачыў, што ідуць людзі да Ільі. Гаварылі, што забяруць яму ружжо, якое ён меў, а яго самога павесяць і скуру здзяруць. Тата вярнуўся да Ільі і зараз яны з'явіліся, але пабачыўшы бацьку адышлі. І бацька сказаў Ільі:

— Дзедку, уцякайце, толькі не да мяне.

І Ілья зараз выбраўся адсюль і бадай жыў у Паўлах пакуль яго саветы не забралі адтуль. А ў яго хаце асталіся жанчыны, якіх ён прыняў у прытулак: удава Аксення і яе незамужняя сястра Клаўдзія, бадай з Кленік. Я іх наведваў, яны прыгожа спявалі, маліліся як у царкве — нічога новага не выдумалі. Былі гэта вельмі добрыя жанчыны — калі ў 1942 годзе загінуў мой бацька, а мама захварэла, то яны нам дапамагалі: лён вырвалі і спралі, а ўжо мама выткала як паправілася. Прыязджалі сюды і Ілья Іванюк з Канюкоў, Надзея Антанюк з Трасцянкі, Васіль Верамяюк з мацераю з Войшкаў і іншыя.

У нашай вёсцы, у хаце Пракопчыка, саветы зрабілі штаб. І салдаты, што той штаб пільнавалі, калі з намі пазнаёміліся, не хвалілі Сталіна. Шкада іх было, бо былі гэта людзі насільна гоненыя.

У вайну хадзілі партызаны: і рускія, і польскія. Сапраўдныя партызаны нікому крыўды не рабілі. Але былі і падшыванцы, якія нарабілі многа зла. А мой бацька, які да вайны солтысам быў, шкадаваў людзей, давяраў ім. А вайна вайною, хадзілі правакатары... У навакольных вёсках людзі гінулі. І майго бацьку немцы скатавалі і застрэлілі; я кожны год іду 11 верасня, на *Галавасека*, у царкву і на бацькаву магілу.

Ілья шмат саду пасадзіў. І было ў Вершаліне такое месца, дзе людзі садзілі садовыя дрэвы як ахвяры. Пасля НКВД лепшыя дрэвы загадала каля школы пасадзіць, а апошнія высеч. Але ўцалелі дрэвы, якія пасадзіў там Філіпюк з Трасцянкі.

— А далёка адсюль у Вершалін? — пацікавіўся я.

— Каля кіламетра.

Мой суразмоўна нарысаваў мне дэталёвы план Вершаліна і расказаў, як туды трапіць. Цёпла развітаўшыся падаўся я лясною дарогаю. На месцы сустрэў я пару пажылых грыбнікоў.

— Вы тутэйшыя? — спытаў я.

— Не. А ў чым справа?

— Недзе тут, — паказаў я на густую хваіну, — павінен быць падмурак.



Контур царквы

Нырнулі мы ў гушчар і зараз паказаўся шукаемы мною падмурак, на якім прарок Ілья задумаў паставіць шпіталь ад сухотаў.

— На прадаўжэнні дарожкі, на ўзгорку, ёсць яшчэ адзін падмурак, — сказалі мне мае выпадковыя знаёмыя, — там царква мела быць.

Яны пайшлі ў сваю дарогу, а я падаўся глядзець месца пад царкву. Падмурак з камянёў зарастае лясною расліннасцю. Ён на плане крыжа: тры канцы ў форме паўкругоў дыяметрам у восем метраў, чацвёрты таксама пачынаецца паўкругам, які пасля пераходзіць у тры прамавугольныя сцяны даўжынёю ў шэсць метраў кожная; апошняя частка выразна абсела ў зямлю. Таўшчыня сцен падмурка — каля васьмідзесяці сантыметраў. У канцы апсіднай часткі абаперты аб дрэва праваслаўны крыж.

Вяртаўся я на аўтобус у Шацілы. Па дарозе, у Нетупе, дагнаў я жанчыну, якая таксама ішла на аўтобус; высветлілася, што яна сама нетутэйшая, мая зямлячка. У Шацілах чакаў яе муж, які раней прыехаў туды на ровары. Даведаўшыся, адкуль я іду, ён расказаў мне:

Спачатку Ілья тварыў цуды, але пасля тая яго моц прапала. Майму брату пакасіла вочы, лячыцца ў лекараў дорага каштавала, павяла мама брата да яго:

— Ілья, ратуй! — папрасіла яна.

Ілья стаў над ім, размахнуў рукамі і крыкнуў:

— Адыдзі ведзьма!

Брату вочы вярнуліся на месца. Жыў іншы мужчына, яму ногі гнілі, не хадзіў ужо. Прыйшоў да яго Ілья, тройчы ўзмахнуў рукамі:

— Ідзі! — сказаў.

І той чалавек устаў і хадзіў аж да смерці, а жыў ён яшчэ шмат.

Той Ілья неграматны быў, — прадаўжаў мой расказчык, — і наймаў рахункаводаў, каб яму грошы лічылі, што людзі прыносілі. То яны, калі ён не бачыў, у рукавы сабе папяровыя банкноты напіхалі. Апошнія банкноты ў мяшкі збіралі, а Ілья іх пералічваў, бо мяшкі лічыць умеў. Манеты таксама ў мяшкі збіралі і ён іх толькі ўзважваў, ці цяжкія.

Гавораць, што Ілью ў Сібір забралі, а гэта няпраўда. Я працаваў у камунальным аўтобусным дэпо ў Беластоку і калісь там працаваў старэйшы мужчына, якога саветы былі вывезлі; сядзеў ён у турме ў Мінску. Расказваў ён мне, што ў той турме сядзеў і Ілья Клімовіч, калі яго саветы забралі, і ў той мінскай турме ён і памёр.

(працяг будзе)

Аляксандр Вярбіцкі

Складаны выбар

У апошні час на нашых старонках з'явіліся невясёлыя весткі з сельскагаспадарчага кааператыва „Рольмак". Хаця яго старшыня, а ў прыватнасці мой добры сусед з дзяцінства, Віктар Рэент супакойвае, што трывожыцца за лёс фірмы не трэба, усё ж такі ў наяўнасці згортванне яе. Няма ўжо ў Беластоку фірменных крамаў, няма оптавага складу і няма мясных прадуктаў „Рольмака". Няма таксама яек, бо адсекі для курэй былі ў Макаўцы на два сантыметры ніжэйшыя ад еўрасаюзных патрабаванняў і трэба было іх ліквідаваць. Гледзячы на апошнюю справу ўзнікае пытанне, як праходзілі акцэсійныя размовы і ці нашы перагаворшчыкі толькі пакорліва пагаджаліся з прынятымі на захадзе правіламі, ці мо баранілі інтарэс нашых вытворцаў і змагаліся за мадыфікацыю саюзных норм дзеля прымеркавання іх да нашых. Астаецца факт — прадстаўляемая нашым афіцыёзам паспяховасць тых размоў вымусіла скарачэнне нашай вытворчасці, вызваленне нейкіх нашых людзей ад працы ў беспрацоўе і магчымую падмену нашых адносна чыстых прадуктаў завозам падобных з хімічнай начынкай. Ці гучная абарона нашым палітычным апалчэннем прынцыпаў з Ніццы нам у карысць — стаўлюся да гэтага скептычна.

У ранейшы час, калі мне было нашмат менш гадоў, рупіла мяне цікавасць іншага свету, адгароджанага ад нас не толькі калючым дротам ці сімвалічным берлінскім мурам, але і бюракратычнымі барыкадамі ды радыёглушыцелямі. Чакаючы ў чэргах ці ездзячы на публічным транспарце не раз чуваць сёння настальгічныя выказванні, што трансфармацыя грамадскага ладу ў нашай краіне парушыла шчаслівую аркадыю, створаную ў нас Геркам. Неяк людзі забылі пра біблейскую аповесць аб поўных і худых гадах. Забылі і пра частую ў нашым побыце з'яву, калі пасля вясёлага пахмелля наступае цяжкая паныласць. Забылі і пра голыя паліцы, калі той „рай" закончыўся яшчэ пры яго стваральніку. І ніякія нараканні не вернуць пазычанай ілюзіі. Таму сёння з палёгкай успрымаю ліквідацыю даўніх бар'ераў і пагаджаюся з патрэбай нейкіх уступак.

У час згаданай трансфармацыі запар з дэмакратыяй на выбарчых участках завітала да нас і адносная дэмакратыя ў рыначных прапановах. Для прыкладу, у крамах маем сёння шырокі выбар тавараў розных вытворцаў і за розныя цэны. І зноў клопат, бо трэба ў гэтым усім багацці разабрацца; дарэчы: так жа, як і ў палітычных выбарах. Найчасцей наш выбар зводзіцца да найпрасцейшага: на ўчастках — да „нашых", а ў магазінах — да найтаннейшага тавару, які нам па кішэні. Даражэйшыя і здаравейшыя нашы прадукты абыдзем бокам, калі побач іх звычым таннейшыя з начынкай у прыгожай упакоўцы; не пацікавімся, хто і што нам прапануе. Тое, што сталася з фірмай „Рольмак", якая свае прадукты вырабляла са здаровых паставак з Гайнаўшчыны, гэта, здаецца мне, вынік нашых рыначных выбараў — без уступак.

За некалькі месяцаў, калі з заходніх граніц будуць зняты таможныя бар'еры, чакаюць нас новыя, яшчэ багацейшыя, рыначныя выбары. І не толькі ад варшаўскіх і брусельскіх чыноўнікаў будзе залежаць, якія нашы прадпрыемствы разам з іх працоўнымі калектывамі — нашымі суседзямі, апынуцца за рыначным бортам. Частка іх лёсу — нашага эканамічнага выжывання — і ў нашых руках. Скупы плаціць двойчы.

Аляксандр Вярбіцкі

Фота КРЫСТЫНЫ КАСЦЕВІЧ

Пень нядаўна ссечанага старога дуба

Згодна з законам

Апошнім часам разгарнулася дыскусія сярод эколагаў і любіцеляў Белавежскай пушчы вакол ссечаных побач мяжы з Беларуссю старых дубоў.

Гоман у мясцовых СМІ ўзбудзіла публікацыя фатаграфій пянькоў з-пад ссечаных дубоў на інтэрнэтнай старонцы, прысвечанай Белавежскай пушчы. Пянькі заўважыў эколаг са Шчэціна, які наведаў Белавежскую пушчу. Паводле эколагаў, на тэрыторыі запаведніка Натуральныя лясы Белавежскай пушчы, якім распараджаюцца Дзяржаўныя лясы, высеклі больш дзесяці векавых (узростам да 200 гадоў) дубоў. Пагранічнікі і працаўнікі Дзяржаўных лясоў стварылі дзве камісіі дзеля праверкі ці высечка старых дубоў адбывалася згодна з законам. Пасля праверкі дакументаў аказалася, што леснікі законна высеклі дубы па просьбе пагранічнікаў. Закон аб ахове дзяржаўнай мяжы, прыняты ў дзевяностых гадах патрабуе, каб у паласе да 5 метраў ад мяжы (з польскага і беларускага бакоў) не раслі дрэвы і кусты. Карчаванне распачалося ў лютым гэтага года. Надляснічы Войцех Нядзельскі з Белавежскага надлясніцтва, на тэрыторыі якога высеклі дубы паінфармаваў, што новы запаведнік Натуральныя лясы Белавежскай пушчы ўзнік у жніўні гэтага года. Згоду на высечку дрэў атрымаў ён ад ваяводскага захавальніка прыроды і паінфармаваў аб гэтым міністра аховы Эву Сыманідэс. Работы на мокрых тэрыторыях Белавежскага надлясніцтва маглі праводзіцца восенню, калі яны падсохлі.

Улады Еўрасаюза патрабуюць, каб дзесяціметровая гранічная зона была чыстай. Пасля ўступлення Польшчы ў Еўрасаюз на граніцы з Беларуссю будзе пастаўлена электронная тэхніка, якая будзе сачыць за перамяшчаннем жывых істот праз граніцу. Новазбудаваныя пагранзаставы і сучасная тэхніка ўчыняць мяжу Польшчы з Беларуссю больш шчыльнай. Прыязнымі маюць быць пагранічныя пераходы, толькі што многім жыхарам Беларусі, якія не займаюцца гандлем, не пад сілу купляць візы ў Польшчу.

Аляксей Мароз

Прэзідэнт занядбаў абавязкі

Футболам я асабліва ніколі не цікавіўся. Зусім выпадкова ўключыў я тэлевізар у сераду 19 лістапада. На адным з дзяржаўных тэлеканалаў маладыя людзі з белым арлом на спартыўных касцюмах заяўлялі, што з беларусамі напэўна выйграюць матч. Маглі гэта зрабіць некалькі дзён раней у Мінску, але вялікі холад не дазволіў паказаць ім сваіх магчымасцей. Журналісты звярталіся таксама да трэнера, які пацвярджаў, што пройгрышу ці выніку ў нічыю зусім сабе не ўяўляе і што ўпэўнены ў далейшым удзельніцтве ў чэмпіянаце Еўропы. Некалькі дзеячаў футбольнага руху, трэнер і самі футбалісты паўтарылі з дзесяць разоў, што каманда Беларусі нашмат слабейшая за польскую. Нехта толькі нясмела заўважыў, што можа не варта так ігнараваць беларусаў, але гэта быў выпадковы голас. Журналісты звярталіся таксама за прагнозам да беларускага трэнера, але той толькі адказаў, што ведае пра тое, як знакамітую каманду мае Польшча, але яго хлопцы будуць змагацца за добры вынік для Беларусі.

Хаця я і не планаваў траціць часу, каб сачыць за тым як 22 маладых хлопцаў бегаюць на спартыўнай пляцоўцы, аднак дэманстраваная самаўпэўненасць палякаў схіліла паглядзець у які спосаб будуць яны змагацца за перамогу. Нешта мне падказвала, што вынік матча можа быць нечакана іншы чым прарочылі гаспадары сустрэчы.

Пасля першай паловы матча Беларусь перамагала адным балам. У перапынку дзеячы, былыя футбалісты і трэнеры задумоўваліся як гэта магло здарыцца, але ўсе былі згодныя, што ў другой палове павінна быць лепей. Мінула чарговых 45 мінут і ніхто не хацеў выступіць перад камерамі тэлебачання. Польская каманда прайграла 0:4 у прысутнасці свае публікі, якая патрыятычнымі лозунгамі, спевамі, крыкам і свістам заахвочвала як магла сваіх футбалістаў. Каментатар тэлебачання пачаў у канцы тлумачыць, што перамога беларусаў — вынік палітыкі Аляксандра Лукашэнкі, які загадаў футбалістам прывезці з чэмпіянату Еўропы медаль. Каб змагацца далей, вымушаныя яны былі выйграць з Польшчай. Выглядае на тое, што толькі прэзідэнт Аляксандр Кваснеўскі занядбаў свае абавязкі.

Яўген Мірановіч

План развіцця павятовых дарог

Радныя Бельскага павета прынялі план развіцця дарожнага будаўніцтва ў павеце да канца 2006 года. План ахоплівае 16 праграм, агульны кошт фінансавання якіх 30 212 463 зл., і прадугледжвае абнаўленне каля 70 кіламетраў павятовых дарог. Будуць гэта, галоўным чынам, ужо пачатыя інвестыцыі і таксама новыя.

Канструкцыя фінансавага плана была аснована на прыдбанні пазабюджэтных фінансавых сродкаў, галоўным чынам з еўрасаюзных фондаў, ды на дэкларацыях паасобных гмінных самакіраванняў адносна ўдзелу ў коштах мадэрнізацыі дарог пралягаючых на іх тэрыторыі.

У Арлянскай гміне прадугледжаны для мадэрнізацыі:

— павятовая дарога Спічкі — Орля за кошт 1 244 600 зл. Сёлета выдаткавана толькі 17 600 зл. на тэхнічную дакументацыю. Інвестыцыя мае рэалізавацца за сродкі павета і дапаможных праграм;

— павятовая дарога ад Тапчыкал да краёвай дарогі н-р 66 за кошт 967 500 зл. Інвестыцыя будзе рэалізавацца за сродкі Арлянскай гміны (30%) і Еўрапейскага фонду рэгіянальнага развіцця.

Спічкі — вельмі актыўная вёска ў Арлянскай гміне, але і адзіная, да якой даязныя дарогі не маюць асфальтавага насцілу.

У самым Бельску будзе мадэрнізавацца вуліца Міцкевіча ад скрыжавання з Відаўскай вуліцай да вуліцы Клеберга; кошт інвестыцыі — 2 516 150 зл.

У Бельскай гміне прадугледжаны для мадэрнізацыі:

— дарога Дубяжын — Казлы — Леўкі да краёвай дарогі н-р 66 за кошт 2 558 000 зл.;

— дарога ад Балестаў да краёвай дарогі н-р 66 за кошт 730 492 зл.;

— дарога Банькі — Налогі за кошт 930 000 зл.;

— дарога ў Пасынках за 180 000 зл.

Нягледзячы на прыняты план, павятовыя ўлады, рэалізуючы сёлетні бюджэт, выканалі стаянку пры вуліцы Міцкевіча (вартасцю 80 тыс. зл.), а ў Верцені Боцькаўскай гміны паклалі асфальт (348 563,13 зл.). Да таго выканалі тэхнічную дакументацыю і аб'явілі таргі на выкананне павятовай дарогі ў Пасынках Бельскай гміны.

Міхал Мінцэвіч

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2004 r. upływa 5 grudnia 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na I kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

„Даўціпы” *Андрэя Гаўрылюка*

Двух ваенных ветэранаў сустракаюцца пяцьдзесят гадоў пасля вайны.

— Помніш, — пытае адзін, — як у акопах гаварылі, што ў ежу нам дадавалі розныя свінствы, каб мы не думалі пра жанчын?

— Помню: былі такія дурноты.

— Якія дурноты!? У мяне гэта пачынае дзейнічаць!

* * *

У купэ для курцоў дзедка дастае з кішэні люльку:

— Ці дазволіце мне?.. — пытае спадарожніцу.

— Чуйцеся, як у сябе дома!

— Добра, — уздыхнуў дзедка і схаваў люльку ў кішэню.

* * *

— Што гэта дом для састарэлых?

— Гэта рэванш дзяцей за яслі.

* * *

Турыст спыняецца каля маляўнічага вадаёма.

— Ці тут бяспечна? — пытае мясцовага.

— А ў чым дакладна справа?

— Ну: ці няма тут акул?

— Няма.

Праз хвіліну, ужо з вады, турыст зноў перапытвае:

— Сапраўды няма тут акул?

— Ну, не: кракадзілы прагналі іх!

* * *

Багамольная жанчына зачапляе на лесвіцы суседа:

— Калі ў будучыні захочаце аддавацца непрыстойнай распусце ў спальні, дык прынамсі закрывайце вокны! Учора вечарам разбэшчаныя фокусы ў вас абурылі ўсіх жыхароў!

— Гэта памылка! Учора, шаноўная пані, я быў у камандзіроўцы.

* * *

Заплаканая бабулька падыходзіць да паліцыянта і лямантуе:

— Бандыт! Забраў усе грошы, што я назбірала: усё мне ўкраў!

— А дзе вы тыя грошы трымалі?

— Вось тут, пад фалдаю спадніцы.

— І вы не чулі, як ён вам іх забіраў?

— Чула, чула, але думала, што ён у прыстойных намерах.

* * *

— Ой! Забыла згаварыць пацеры, — устрывожана гаворыць ужо ў ложку бабулька дзедку. — Трэба ісці па ружанец.

— Нікуды не хадзі, а свае пацеры згавары на маіх худых рэбрах.

Бабулька так і зрабіла, а скончыўшы адвярнулася ад худзізны...

— А ў медалік не пацалуеш? — дапытваецца дзедка.

* * *

Сужонства пражыло з сабою доўгіх пяцьдзесят гадоў. Юбілярку пры гэтай нагодзе журналіст спытаў:

— Што прычынілася да такога шчаслівага сужыцця?

— Усё жыццё між намі была дамова, што ніколі не трэба сварыцца, а ў выпадку рознагалоссяў выйсці з хаты на даўжэйшы шпацыр...

— А дзе ваш муж?

— Там дзе заўсёды: з самой раніцы на прагулцы.

Адгаданка

Рашэнне адгаданкі прачытаецца за адзін праход шахматнага каня, пачынаючы ад падкрэсленай літары. (Ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 42 нумара

Свісток, дыктант, андарак, падэшва, артапед.

Рашэнне: **Віктар Швед.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

Я	В	Ч
Ы	📖	Н
І	Н	К

Я вас не ведаю!

— Вы не ўвойдзеце. Вас не акрэдытавалі, — пачуў журналіст „Нівы” ад прэс-інфарматаркі падляшскага ваяводы, статнага службоўца Бюро аховы ўрада. Заява прагучала ў вушах журналіста гэтак: „Вас тут не жадаюць!” Яму, аднак, вельмі хацелася ўвайсці на прэс-канферэнцыю (бо ж яна і на тое) прэм’ера Лешка Мілера, пасля ягонай сустрэчы з актывам СЛД.

— Гэта не ваяводская ўстанова запрашала, а СЛД, — тлумачыла прэс-інфарматарка ваяводы, упускаючы на канферэнцыю паводле спіску па чарзе прадстаўнікоў беластоцкай „Выбарчай”, „Вспулчэснай”, „Параннага”, Польскага прэсавага агенцтва, Радыё Беласток, Радыё Акадэра. — Я толькі прэс-інфарматарка ваяводы, — дадала прэс-інфарматарка ваяводы, які адначасова старшыня падляшскага Саюза. — Але, прашу, пачакайце.

Журналіст, як і належыцца прадстаўніку газеты беларускай меншасці, пакорліва чакаў рашэння прадстаўнікоў кіруючай большасці.

Раптам паявілася каманда агульнапольскай тэлестанцыі TVN-24.

— Вы не ўвойдзеце. Вы не былі акрэдытаванымі.

Ніўскі журналіст уздыхнуў з палёгкай:

— Гэтак не толькі да мяне...

І адважна папрасіўся:

— Дык, можа, я паразмаўляю з прэс-інфарматарам СЛД?

— У падляшскага СЛД няма прэс-інфарматара, — даведаўся ад швейцара-прэс-інфарматаркі ваяводы-старшыні СЛД. — Калі ласка, чакайце.

Журналіст неспакойна затупаў — вельмі ж хацелася перадаць сваім Чытачам, частцы польскага грамадства, што іхны прэм’ер і шэф кіруючай партыі хоча ім сказаць:

— Ну, добра. Можа, будзе цікавей, калі вы мяне не ўпусціце. Нашы чытачы ўжо будуць ведаць, што аб гэтым думаць.

— А вы са мною так не гаварыце! — абурылася ваяводава прэс-інфарматарка. — Я таксама была журналісткай (беластоцкага тэлебачання).

За яе заступіўся рослы службовец Бюро аховы ўрада:

— Я ж не ведаю, хто вы.

— Можаце запытацца хоць бы ў міністра Цімашэвіча, які мяне ведае. Ну, пытайце ў яго.

— Але ж я вас не ведаю! — здзівіўся целаахоўнік.

У вушах журналіста прыгадаліся выказванні мядзведзя Сандара Жоржавіча наконт лані Гаўрусіхі.

— Ну, добра, добра. Я вас ведаю, — пастаралася палагодзіць вострую ўжо сітуацыю прэс-інфарматарка ваяводы, але не старшыні.

Целаахоўнік пазычыў ад журналіста самапіску і ўвёў яго ў спісак.

Прэс-канферэнцыя працягвалася хвілін з дваццаць. Журналіст увесь час адчуваў на спіне дых нярадага целаахоўніка. Баяўся нават выцягнуць самапіску, якой той толькі што заносіў у спісак прозвішча нахабнага пісакі.

МакХолад

P.S. У час іншай прэс-канферэнцыі ў той жа дзень, на прагранпераходзе ў Кузніцы-Беластокай прэм’ера Мілера і міністра Цімашэвіча, пачуўся наступны дыялог:

Журналістка нямецкай тэлестанцыі ARD:

— Ці, на вашу думку, мытнікі ахвотна перанясуцца на ўсходнюю мяжу, напрыклад, у Кузніцу?

Прэм’ер Мілер:

— Думаю, што так. Тут знакамітыя ўмовы.

Журналістка:

— А вы? Ці вы перасяліліся б сюды з Варшавы?

Прэм’ер Мілер:

— ???

Міністр Цімашэвіч:

— Але ж спадар прэм’ер — не мытнік!

Перапалка з Парыпалкам

Зноў прыехалі да мяне ў госці ломжынскія знаёмыя, Перапалка з Парыпалкам. Абодва Міраславы Роберты. Той Перапалка хоча, каб яго называць Мірыкам, а Парыпалка — Робікам. Хоць гэта адно добра. Мне яны заўсёды былі аднолькавыя, а ведаю іх яшчэ з арміі. Там, у аднолькавых мундзірах, абстрыжаныя на калена, усе салдаты бы блізняты. І прозвішчы маіх знаёмых усім блыталіся. А трапляліі яны разам у розную кабалу, у перапалкі, парыпаныя як належыць двум жыхарам Падляшскай зямлі. Абодва яны родам з Беласточчыны, дык там у чужой старонцы неяк мы пасябравалі. Але тады і мне здаралася ў тыя „перапалкі” трапляць, і таму мне Мірык і Робік асацыююцца хоць з часам вясёлай і жвавай маладосці, але і з некаторымі непрыемнымі здарэннямі. Да таго ж я — Вандал, дык і тройца атрымлівалася выдатная. А цяпер, калі заваляцца хлопцы да мяне, дык чакай бяды. Ну, хоць бы жартаў. І доўга застолля, калі ставіш ты.

— Няма яе? — запытаўся Перапалка.

— Каго? Гарэлкі?

— Ну, твае Агаты. Я пры ёй не адчуваю сябе свабодна.

— Яна мяне дурненькім лічыць, — дадаў Парыпалка. — А гэта непрыемнае пачуццё, калі лічаць, што ў цябе глузду няма.

— Я аж здзівіўся, што ў цябе, мілы мой Парыпалка, ёсць магчымасць мець нейкія пачуцці, — азваўся я. Нашы размовы пачыналіся падобна.

І я разліў па чарках.

— Не замаленькі ў цябе посуд? — Перапалка зняў з сушылкі над ракавінай шклянкі. — Ты не бойся, мы з Ломжы прыехалі не з пустымі рукамі.

Я ўключыў газ на пліце.

— Ты што, Вандал, супам думаеш нас частаваць?

— О, якраз у мяне вайсковая гарохаўка. Паўспамінаем.

Адчыніў я халадзільнік. Апрача кансервы з ялавічынай для мае сучкі (не хацелася гатаваць ёй кашы з мясам, дык купіў гатовую сабачую страву) ляжаў ладны кавалак кумпяка.

— О, у нас у Ломжы дык мяса мякчэйшае, — Перапалка кульнуў чарачку і закусіў. — Цыбульку!

— Закусь без цыбулькі — не тое! — пацвердзіў Парыпалка і стаў даставаць з торбы свой пачастунак.

— О-го, бачу, вы як не ў госці! — здзівіўся я. Калі з’яўляліся Перапалка з Парыпалкам на дзень, дык даводзілася іх карміць найменш тыдзень. І на дарогу назад даць на білеты.

— А, вось, мы ў сталіцу прыехалі. У сталіцу ваяводства! — пацёр рукі Перапалка. — Няма Агаты, спакойна пажывем з табою. А хлопцы мы прыстойныя, дык як жа ж без ежы... Твая ж у Амерыцы...

— Вось, такі дэсант! Не горш за палітычны! І партыйцы, і старшыні, і кіраўнікі...

— Ну, — паківаў галавою Мірык Перапалка. — Хоць мы і на пенсіі, але пакруціцца можна. У Ломжы размаху не маем аніякага.

— Дык заўтра разглянемся, што да чаго, — Робік Парыпалка ўзяўся кроіць мой кумпяк тоўстымі лустамі.

Вандал Арлянскі

ISSN 0546-1960